ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ

ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ

КОШТ НУМАРУ Ў ГОРАДЗЕ І РАЁНАХ 5 кап.

РЭДАКЦЫЯ: Палац працы, 3-ці паверх, пан 39, 40, 41, 43. Тэлеф. агульны . 2-85, „ рэдактара 1-73, „ сакрат. і х-ры . . 72.

Падпісная цана ў месяц: Для рабочых, служачых і калгаснікаў . . — р. 80 к. Для ўстаноў . . . . . 1 „ — „ З дадаткам „Чырвоная Беларусь“: Для рабочых, служачых і калгаснікаў. . . 1 „ — „ Для ўстаноў . . . 1 „ 20 „

Плата за абвесткі: За радок нотыту . . . . . 30 кап. Для іншагародніх . . . . . 40 „ Пры шматразовым друкаванні скідка ад 30 да 50 проц.

ГОД ВЫДАНЬНЯ 14-ты.

ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА ГАРКОМУ КП(б)Б, ГАРСАВЕТУ І ГАРПРАФСАВЕТУ. № 215 | Панядзелак, 28 верасьня 1931 г. | № 215

НЕЛЬГА РАЗЬМЯРКОЎВАЦЬ ДАХОДЫ БЕЗ ДАКЛАДНАГА ЎЛІКУ ПРАЦЫ

ІГНАРУЮЧЫХ ПАСТАНОВЫ ГАРКОМУ І ГАРПРАФСАВЕТУ ДА АДКАЗНАСЬЦІ

Аб разьмеркаваньні даходаў у калгасах

(Пастанова сэкратарыяту гаркому КП(б)Б ад 21 верасьня 1931 года).

Улічваючы зусім нездавальняючае становішча з падрыхтоўкай да разьмеркаваньня даходаў у калгасах і наяўнасьць момантаў, скажаючых прынцыпы разьмеркаваньня даходаў па колькасьці і якасьці працы (ядоцкая ўраўніловка), сакратарыят гаркому КП(б)Б пастанаўляе:

Вясковым партячэйкам, фракцыі райкалгассаюзу, партчастцы сельсаветаў і кіраўнікам калгасаў мабілізаваць на правядзеньне разьмеркаваньня даходаў у калгасах, унядрэньне зьдзельшчыны і наладжаньне ўліку, увесь вясковы партыйны, камсамольскі актыў і настаўніцтва. Правесьці сярод калгаснікаў растлумачэньні пастановы Наркамзему і калгасцэнтру СССР аб разьмеркаваньні даходаў па колькасьці і якасьці працы і стварэньні адпаведных фондаў. Фракцыі райкалгассаюзу даць адпаведныя паказаньні калгасам аб парадку стварэньня непадзельных фондаў і адлічэньняў з даходаў, у адпаведнасьці з пастановамі бюро ЦК КП(б)Б і Наркамзему і калгасцэнтру БССР.

Накіраваць у калгасы 35 адказных брыгадзіраў (у сярэднім па аднаму на кожныя 5 калгасаў) і па аднаму аграному на сельсавет, а таксама 100 рахунковых працаўнікоў з прадпрыемстваў і ўстаноў гораду на тэрмін з 23-га верасьня да 15-га кастрычніка для дапамогі ў разьмеркаваньні ўраджаю.

Прапанаваць вясковым партячэйкам, вылучаным брыгадзірам і кіраўнікам калгасаў да 1-га кастрычніка вытварыць папярэдні падлік даходаў, выдаткаў, выдадзеных авансаў, вучот і запіс працадзён калгаснікаў.

Да 15 га кастрычніка скончыць стварэньне фондаў з такім разьлікам, каб да 1-га лістапада выдаць калгаснікам 2/3 прычытаючыхся ім даходаў.

Фракцыі райкалгатсаюзу даць адпаведныя паказаньні калгасам аб прымацаваньні пасылаемых рахункаводаў да рахункових працаўнікоў калгасаў з мэтай падрыхтоўкі і інструктажу брыгадзіраў па галінам працы ў калгасах для самастойнага вучоту і запісу працадзён.

Абавязаць кіраўнікоў калгасаў, сельсветаў, брыгадзіраў сканцэнтраваць увесь вучот і нагляд за ходам разьмеркаваньня даходаў пры сельсаветах з мэтай дэталёвай інфармацыі гарсавету і райкалгассаюзу праз кожныя 5 дзён.

Калгас імя „1-га мая“ да разьмеркаваньня ўраджаю не падрыхтаваўся

У калгасе «1 га мая», Старасельскага сельсавету, шмат недахопаў.

Апрацоўка глебы вытвараецца дзядоўскімі спосабамі. На адным і тым жа кавалку глебы штогодна засяваецца адна і тая ж культура. Нормы выпрацоўкі ня выконваюцца. Пляну севазвароту няма. Улік працадзён не наладжан, што не дае магчымасьці прыступіць да разьмеркаваньня даходаў і ўраджаю ў калгасе.

«Віцебскі Пралетары» неаднаразова сыгналізаваў аб брыдкасьцях, маючых месца ў калгасе, але праўленьне да сыгналаў друку не прыслухоўваецца.

Зараз калгас павінен разьмяркаваць ураджай, але бяз уліку працы гэтага немагчыма будзе зрабіць. Трэба безадкладна наладзіць гэты вучот.

Партыйная ячэйка ў гэтых адносінах павінна праявіць бальшавіцкую энэргію. За разьмеркаваньне ўраджаю па колькасьці і якасьці працы і зьнішчэньне ўсіх недахопаў, маючыхся ў калгасе, неабходна ўзяцца зараз-жа.

Сімакоў.

Разьмеркаваць даходы па колькасьці і якасьці працы

Віцебскі раён на 25-га верасьня калектывізаван на 72,7 проц.

Калгасы ў час веснавога і асеньняга севу засеялі 16.662 га яравых культур і 5982 га азімага жыта. Ураджай, дзякуючы ўдарнай працы калгаснікаў, сваечасова ўбраны з поля.

Зараз перад калгасамі стаіць баявая задача—правільна і сваечасова разьмеркаваць даходы і ўраджай паміж калгаснікамі выключна па працаднёх, па колькасьці і якасьці выкананай кожным калгаснікам працы.

Для дапамогі ў падліку працы і правядзеньні разьмеркаваньня ўраджаю па калгасах пастановай сакратарыяту гаркому партыі і гарпрафсавету ў калгасы накіроўваюцца 100 рахункаводаў і 34 адказных брыгадзіры.

На сёньняшні дзень у калгасы накіравана толькі 40 рахункаводаў.

Гаспадарнікі прадпрыемстваў усё яшчэ не жадаюць зразумець важнасьці правільнага і сваечасовага разьмеркаваньня ўраджаю і сьвядома зрываюць пасылку рахункаводаў у калгасы. 36 прадпрыемстваў і арганізацый Віцебшчыны яшчэ не вылучылі ніводнага рахункавода. Рахункаводы заводу „Чырвоны металісты“—Міленўскі, друкарні «Камінтэрн»—Гіршэўская, ашчадкасы—Матла і Гурэвіч, канторы сплаву—Антаненка, арцелі „Уперад“—Вейля, атрымаўшы пуцёўкі, не зьявіліся на працу ў калгасы. Шмат вылучаных рахункаводаў адмовіліся ад паездкі ў калгасы, прыдумваючы розныя „аб'ектыўныя прычыны“.

Гарком партыі і гарпрафсавет павінны зараз жа прыцягнуць да адказнасьці тых гаспадарнікаў, якія яшчэ на сёньняшні дзень ня вылучылі рахункаводаў, для пасылкі ў калгасы.

Прафсаюзныя арганізацыі павінны рэагаваць на дэзэртыраў з фронту разьмеркаваньня даходаў і ўраджаю ў калгасах.

Пастанова гаркому партыі і гарпрафсавету павінна быць выканана.

Толькі сваечасовае і правільнае разьмеркаваньне даходаў у калгасах вырашае задачу арганізацыйна-вытворчага замацаваньня іх.

Бярэце прыклад

Калгас імя т. Молатава ўсю работу перавёў на зьдзельшчыну. Працоўныя кніжкі выдадзены кожнаму калгаснику, рэгулярна вядзецца табель работы. Папярэдняе разьмеркаваньне даходаў калгас ужо зрабіў. Створаны страхавыя, насенныя і кармавыя фонды. Свае абавязкі па здачы збожжа дзяржаве калгас выконвае з посьпехам.

2/3 усяго ўраджаю будуць разьмеркаваны паміж калгаснікамі да 1-га лістапада.

„Наша праграма можа і павінна быць выканана“ (Сталін)

З ДНІ ЗАСТАЛОСЯ ДА КАНЦА 3-га КВАРТАЛУ

Раўняцца па тэмпах валасапрадзільнай і 8-й маладзежнай істужкі ф-кі „Сьцяг індустрыялізацыі“

Сустрэць чацьвёрты квартал мабілізацыяй рабочых мас на ажыцьцяўленьне сацыялістычнага дагавору з прафсаюзамі Заходняй вобласьці

Падрыхтуемся да сустрэчы 4-гагоду пяцігодкі

Арганізацыя сустрэчнага прамфінпляну на 1932 год і прапрацоўка яго сярод рабочых мас на прадпрыемствах патрабуе:

Мабілізацыі рабочых мас вакол ажыцьцяўленьня сацыялістычнага дагавору з прафсаюзамі Заходняй вобласьці, падагульваньня канкрэтных вынікаў ходу выкананьня прамфінпляну 4 га кварталу па месяцах.

Пастановай прэзыдыуму гарпрафсавету прапануецца

Пастаноўка дакладаў гаспадарнікаў на рабочых сходах у цэхах, у клюбах, аб задачах прадстаячага гаспадарчага году з канкрэтнымі лічбовымі паказчыкамі.

Арганізацыя зьлётаў ударнікаў па пытаньням лепшай арганізацыі сустрэчнага прамфінпляну апошняга завяршаючага году пяцігодкі. Прафарганізацыі робяць вынікі становішча ўдарніцкага руху на вытворчасьці і далейшай задачы па 100 проц. ахопу рабочых ударніцтвам шляхам пераводу на вышэйшыя формы сацыялістычнай працы.

Уся арганізацыйна масавая работа прафарганізацый па сустрэчнаму на 1932 год павінна быць увязана з непасрэднай работай усіх фабрычна-заводзкіх арганізацый да сьвяткаваньня 14-й гадавіны Кастрычніка рэвалюцыі, для чаго неабходна **распачаць падрыхтоўчую працу па арганізацыі гаспадарча разьлікових брыгад імя 14-й гадавіны Кастрычніка.**

На працягу кастрычніка **зрабіць сталую пазавоку рэалізацыі прамовы т. Сталіна** пад кутом погляду перабудовы прафработы ў сьвеце паказаньняў тав. Сталіна, увязаўшы гэтую праверку з канкрэтнымі задачамі сустрэчы 1932 гаспадарчага году.

У аснову прапрацоўкі контрольных лічбаў 1932 г. павінна быць пакладзена:

Распрацоўка і ажыцьцяўленьне рацыяналізатарскіх плянаў і дальнейшая механізацыя прадпрыемстваў. Мабілізацыя ўнутраных рэсурсаў, выяўленьне ўсіх магчымасьцяў лепшага скарыстаньня абсталяваньня і інструментаў і замацаваньне сталых вымераў за варштатам. Усямерна ўзмацніць барацьбу па ўсіх галінах за павышэньне працоўнай дысцыпліны. Дабіцца поўнага зьнішчэньня прагулаў, прастояў і г. д. Забясьпечыць найбольш поўны ўдзел інжынэрна-тэхнічных работнікаў ва ўсіх этапах падрыхтоўкі сустрэчнага прамфінпляну і яго выкананьня. Прапанаваць гарМБІТ арганізаваць гарадзкі сход ІТР па гэтаму пытаньню.

Распрацаваць мерапрыемства па пераходу на 4-брыгадны графік пры 3-зьменнай рабоце і вырашыць пытаньне аб арганізацыі плянавага папярэдняга рамонту.

Распрацаваць мерапрыемствы па зьмяншэньню норм выдаткаваньня сыравіны палуфабрыкатаў і матэрыялаў на адзінку прадукцыі. Рацыянальна скарыстаць адыходы. Паставіць пад жорсткі рабочы кантроль скарыстаньне цэхавых і агульнагазадзкіх выдаткаў, **дабіваючыся выманьня вызначаных паказчыкаў па вынімэньні сабекошту.**

Павышэньне якасьці выпускаемай прадукцыі патрабуе неадкладнай праверкі становішча тэхнічнага кантролю. Практыкаваць сыстэматычную праверку выкананьня ўзятых на сябе абавязкаў адміністрацыяй, рабочымі, ІТР і бракеражам Штодзённа сачыць за выкананьнем пастановы канфэрэнцыі па якасьці прадукцыі. Праверыць як выконваюцца стандарты на паўфабрыкаты і гатовую прадукцыю.

Культустановам забясьпечыць поўнае абслугоўваньне прапрацоўкі сустрэчнага прамфінпляну 1932 году праз клюбы, чырвоныя куткі, навучальныя ўстановы і г. д.

Уся работа па падрыхтоўцы сустрэчнага прамфінпляну павінна праводзіцца пад непасрэдным кіраўніцтвам заўкомаў шляхам арганізацыі стала дзейнічаючых плянава-аператыўных брыгад з удзелам усіх фабрычна-заводзкіх арганізацый.

Прасіць ЦСПСБ узьдзейнічаць на гаспадарнікаў аб'яднаньняў аб сваечасовай дасылцы распрацаваных кантрольных лічб на гаспадарчы год. Устанавіць сталы кантроль за ходам прасоўваньня сустрэчных прамфінплянаў праз аб'яднаньні і за выкананьне абавязкаў гаспадарнікамі апошніх.

Сыстэматычна асьвятляць ход прапрацоўкі сустрэчнага на 1932 г. праз мясцовы друк і цэнтральныя газэты, шырока папулярызуючы добрыя прыклады работы з мэтай абмена вопытам. **Рэалізаваць дырэктывы ЎСЦСПС аб замаху рабочых ударнікаў у прафдрум.**

Выкліканць на спаборніцтва па пытаньням лепшай арганізацыі работы сустрэчнага на 1932 год гомельскі гарпрафсавет.

Ліквідаваць гонебнае адставаньне

Швэйны волат „Сьцяг індустрыялізацыі“ ня выходзіць з палясы ганебных прарываў. За 20 дзён верасьня прамфінплян выканан на 76,9 процантаў. Уперадзі ідзе бручны цэх, выканаўшы заданьне на 86,2 проц. Адстае палітоцэх, даўшы 68,1 проц.

Прычыны такога ганебнага адставаньня крыюцца ў тым, што работа ідзе самацёкам. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў цэхах і істужках паслабла.

Толькі за 20 дзён верасьня швэйны волат недадаў краіне 18393 пар брук, 13413 пінжакоў і 7215 палто.

Хлебанарыхтоўчыя раёны і будаўніцтва буйных пабудоў патрабуюць ад швэйнікаў сотні тысяч брук, гарнітураў і палто.

Прамфінплян швэйнай ф-кі ўпаўне рэальны, аб гэтым сьведчыць перавыкананьне прамфінпляну 2-га кварталу.

У адказ на тэлеграму ВСНГБ, Белшвэйаб'яднаньня і ЦП саюзу швэйнікаў, дзе гаворыцца аб ганебным адставаньні ф-кі, рабочыя швэйнага волату абвясцілі сабе мабілізаванымі на ліквідацыю прарываў і выкананьне прамфінпляну 3 га кварталу.

Б. Зэліксон.

Датэрмінова скончыць праграму 3-га кварталу

Швэйная ф-ка «Прафінтэрн» прамфінплян за 25 дзён верасьня выканала на 104,1 проц. Паўпалітовы цэх, які ўвесь час ішоў упераздзе, уступіў першынство цэху дзіцячага палітo, які свой плян перавыканаў на 5 процантаў.

За апошнюю 5-дзёнку гэтыя цэхі значна паслабілі тэмпы працы. **Першы недавыканаў заданьне на 0,7 проц., другі—на 14,4 проц.** Тлумачыцца гэта тым, што ватны цэх зноў не дае належнай колькасьці ватнікаў. Фабрычная адміністрацыя за апошнія дні не аддае належнай увагі рабоце ватнага цэху.

Рашэньні канфэрэнцыі па якасьці рэалізуюцца марудна. Процант браку і пераробак ідзе ўніз чарапашшымі тэмпамі.

Самаабавязацельства рабочых аб датэрміновым выкананьні пляну 3-га кварталу павінна быць выканана. Для гэтага неабходна, каб уся ўвага фабрычнай адміністрацыі была накіравана на палепшаньне работы ватнага цэху. Трэба, як мага хутчэй, аздаравіць работу мэханічнай майстэрні.

Фабрыка «Прафінтэрн» павінна праграму 3-га кварталу скончыць датэрмінова.

Пост «В. П.» Узьдзін.

«За сваечасовы пуск «518»

Да 14-й—шчацінны у строй

Не спасылацца на „аб'ектыўныя“ прычыны

Пастановай ураду і бюро гаркому партыі пабудова шчацінняга камбінату абвешчана звыш ударнай.

Сваечасовы пуск шчацінняга камбінату адыгрывае вялізарнейшую ролю ў справе выкананьня экспартных плянаў.

Як-жа будаўнічыя арганізацыі выконваюць пастановы ўраду і гаркому партыі, каб забясьпечыць пуск камбінату к 14-й гадавіне Кастрычнікавай рэвалюцыі.

Будаўнічыя арганізацыі, будаб'яднаньні, Белшчаціна, Белэнэргія і камтрэст ня прымаюць належных мер, каб забясьпечыць выкананьне пастановы гаркому партыі. Замест таго, каб сапраўды па-ўдарнаму мабілізоўваць сябе на выкананьне будаўнічых плянаў, яны спасылаюцца на аб'ектыўныя прычыны. Прараб будаб'яднаньня т. Фрадкін на апошняй тэхнічнай нарадзе заявіў, што будаўнічыя работы па сушылцы і кацельнай раней сьнежня нельга скончыць, бо «як я буду будаваць, калі ў мяне няма пяску, цэглы, вапны, рабсілы і г. д.».

Як-жа абстаіць справа ў сапраўднасьці? Цэглы маецца на пляцу ў дастатковай колькасьці, вапны таксама. Белэнэргія і камтрэст не прыступаюць к работам па пракладзе каналізацыі, водаправоду і пракладцы кабелю, ня гледзячы на тое, што маюцца ўсе неабходныя матэрыялы, а займаюцца яны толькі абяцанкамі.

Працоўная дысцыпліна кульгае, няўвязка ў рабоце тэхнічнага пэрсаналу значна адбіваецца на рабоце. Тэхнічны пэрсанал не павярнуўся тварам да вытворчасьці. Да гэтага часу работа не перабудавана на ўдарныя рэйкі. Не разгорнута сацспаборніцтва і ўдарніцтва. З-за нядбайных адносін тэхніка Бычкоўскага да ўстаноўкі катлоў у кацельнай, няма магчымасьці прыступіць да абмуроўкі іх. Белшчаціна слаба кіруе работай тэхнічнага пэрсаналу, што затрымлівае ход работы.

Самымі галоўнымі аб'ектамі работ у сучасны момант зьяўляюцца—кацельная і сушылка, без чаго пуск шчацінняга камбінату немагчым.

Усе арганізацыі, маючыя адносіны да пуску камбінату, павінны зьвярнуць асаблівую ўвагу на сваечасовае забесьпячэньне гэтых аб'ектаў неабходнымі матэрыяламі.

Трыкутнік пабудовы бязьдзейнічае. Апошняя пастанова гаркому партыі не даведзена да рабочых. Рабочыя не мабілізаваны на ліквідацыю прарываў, на хутчэйшае сканчэньне будаўніцтва. Рабачком на чале з старшынёй тав. Пістуновічам амаль ніякай работы не праводзіць. Зусім адсутнічае работа сярод ударнікаў. Не выяўляюцца лепшыя і лжэўдарнікі. Ніякага кіраўніцтва сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам з боку рабачкому няма. Вытворчы сэктар рабачкому амаль не вядомы. Ня лепш пастаўлена культурна-выхаваўчая работа, якая на пабудове не адчуваецца.

Зусім адсутнічае работа сярод рабкораў-ударнікаў. За ўвесь час да прыходу рабкораўскай брыгады ніводнага нумару насьценнай газэты ня было выпушчана.

Партыйная ячэйка Будаб'яднаньня таксама нічога ня робіць, каб забясьпечыць сваечасовы пуск камбінату.

Рабачком ударнай пабудовы ня справіўся з пастаўленай перад ім задачай.

Гарпрафсавет павінен забясьпечыць неадкладную перабудову прафработы ў адпаведнасьці з запатрабаваньнямі сучаснага моманту.

Пастанова ўраду і гаркому партыі аб пуску шчацінняга камбінату да 14-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі павінна быць выканана.

Адзін з «518» павінен быць сваечасова пушчаны ў ход.

Л. Войцэнка.

Аказаць дапамогу шчацінняму камбінату

К 14-й гадавіне Кастрычнікавай рэвалюцыі павінна быць скончана пабудова аднаго з «518» шчацінняга камбінату. Здавалася, што прадпрыемствы, якія перайдуць у новы камбінат, зараз-жа мабілізуюцца і акажуць усялякую дапамогу, каб сваечасова скончыць будаўніцтва, але трыкутнікі шчацінняй, шчотачнай і валасапрадзільнай фабрык не аказваюць ніякай дапамогі будаўніцтву і на ўсе просьбы дырэкцыі шчацінняга камбінату аб узяцьці шэфства над пабудовай, да гэтага часу нічога ня зроблена.

Часу да сканчэньня будаўніцтва засталося мала. Неабходна зараз-жа мабілізаваць увагу ўсёй грамадзкасьці гэтых прадпрыемстваў і аказаць канкрэтную дапамогу новаму волату пяцігодкі.

Л.

Абвяшчаем сябе мабілізаванымі

Мы, рабкоры ўдарнікі, улічваючы важнасьць пуску шчацінняга камбінату, абвяшчаем сябе мабілізаванымі і бярэм на сябе абавязак: прымаць актыўны ўдзел у вытворчай і грамадзкай рабоце пабудовы.

Дабіцца выпуску насьценнай газэты не радзей аднаго разу ў 5 дзён і сыстэматычна асьвятляць ход будаўніцтва ў «Віцебскім Пралетары».

Канкрэтна выяўляючы хібныя дасягненьні ў рабоце будаўнікоў, рамуча выкрываючы тормазы ў рабоце, мы асабістым прыкладам будзем змагацца за сваечасовы пуск аднаго з «518».

Брыгада сьлесараў: Войцэнка, Шлейфер, Гутковіч, Грахольскі, Кайцаці, Фенкельштайн, Шэр, Запокыцін.

КРУТА ЎЗЬНЯЦЬ ТЭМПЫ уборкі БУЛЬБЫ, сяўбы, зяблівай успашкі

Узьняць 4000 га цаліны!

Толькі Вяліка-Лётчанскі сельсавет поўнасьцю выканаў плян азімага севу. Па астатніх жа сельсаветах маецца ганебнае адставаньне. Раённы плян на 25 га верасьня па калгаснаму сэктару выкананы толькі на 79 процантаў і аднаасобнікамі на 91 процант. У сіласаваньні кармоў мы маем зрух, дасягнуўшы 71 проц. пляну. Лепшыя прыклады даюць Шумнянскі і Вяліка-Лётчанскі сельсаветы, якія па калгасах пляны сіласаваньня выканалі поўнасьцю. Рудакоўскі сельсавет набліжаецца да выкананьня пляну па калгасах і арганізаваў групавую закладку сіласу ў аднаасобным сэктары на 124 тоны.

Зусім дрэнна ідзе зяблівая ўспашка. Калгасы выканалі свой плян толькі на 1,1 проц. Аднаасобнікі-ж зусім яшчэ не пачыналі ўзьняцьця зябі. Усё гэта складае рэальную пагрозу зрыву зяблівай успашкі. Калі ў восень мы не падымем пад зяб усю вольную плошчу і ня ўспашам дадаткова 4000 га цаліны, мы ні ў якім разе ня зможам у вясну 1932 г. засеяць вызначанай па пляну плошчы ў 54000 га. Гэта павінны добра памятаваць кожны сельсавет, саўгас і калгас.

На ўзьняцьцё зябі неабходна зараз-жа пераключыць ня менш 30 проц. коняй. Вакол гэтай адказнейшай работы патрэбна сканцэнтраваць увагу калгаснікаў і аднаасобнікоў.

Аграном Бекарэвіч.

Засеяна азіміны і ўзьнята пад зяб на 25-га верасьня

Калгасамі

Засеяна азімых

План	Выканана	% вык.
8250 га	6519 га	79

Узьнята пад зяб

План	Выканана	% выкан.
14.430 га	165 га	1,1

Аднаасобнікамі

Засеяна азімых

План	Выканана	% выкан.
3312 га	3021 га	91

Узьнята пад зяб

План	Выканана	% выкан.
5270 га	—	—

ЗА ШМАТМІЛЬЕННЫ БІЦЦА НЯ ТОЛЬКІ ДА СЬВЯТ

ЗАХОЎВАЮЧЫ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ АДБОР, ЗАМАЦОЎВАЮЧЫ НАВІЧКОЎ, КАМСАМОЛЬСКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ ПАВІННЫ І НАДАЛЕЙ НЕ ПАСЛАБЛЯЦЬ БАРАЦЬБЫ ЗА СТОПРАЦЭНТНАЕ УЦЯГНЕНЬНЕ Ў САЮЗ РАБОЧАЙ І БАТРАЦКАЙ МОЛАДЗІ, ЗА ЎЦЯГНЕНЬНЕ Ў КАМСАМОЛ ПЕРАДАВОЙ КАЛГАСНАЙ МОЛАДЗІ

Аб ходзе росту камсамольскай арганізацыі

(Пастанова сакратарыяту гаркому ЛКСМБ ад 24 верасьня 1931 г.)

Заслухаўшы даклады камітэтаў і ячэек: панчошнай ф-кі, к-ву цягі МБВ чыг., ф-кі „Прафінтэрн», фанэрнага заводу, шчацінной ф-кі і аўтабазы аб ходзе росту камсамольскай арганізацыі, сакратарыят гаркому адзначае, што па раду ячэек і калектываў пасьля правядзеньня МЮД маецца значнае паніжэньне тэмпаў росту, што зьяўляецца вынікам апартуністычнай стаўкі на самацёк з боку асобных ячэек КСМ.

1. За праяўленьне апартунізму ў росьце камсамольскай арганізацыі зьняць з работы сакратара яч. шчацінной ф-кі т. Зэльмановіча і справу аб ім перадаць у КК. Бюро калектыву ф-кі «Прафінтэрн» аб'явіць вымову.

2. Папярэдзіць усе ячэйкі КСМ аб зусім недапушчальнай тэндэнцыі ў зьніжэньні тэмпаў росту і правядзеньні яе кампанейскім наскокам.

Барацьба за шматмільённы камсамол зьяўляецца штодзённай задачай камсамольскай арганізацыі.

3. Сакратарыят гаркому прапануе ўсім ячэйкам КСМ заразжа павысіць тэмпы росту камсамольскай арганізацыі, уся праца па росту павінна быць праведзена шляхам масавай работы і індывідуальнага падходу к прымаемым. Уся праца па росту павінна быць цесна ўвязана з барацьбой камсамольскай арганізацыі за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

4. Указаць к-вам камсамолу: «Чырвоны мэталіст» і фанэрнага заводу на недапушчальнае зацягваньне афармленьня ўноў прынятых у КСМ. Прапанаваць паказаным калектывам у двухдзённы тэрмін аформіць увесь маючыйся матар'ял.

5. Прапанаваць усім камітэтам, калектывам і ячэйкам кожныя тры дні інфармаваць ГК КСМ аб ходзе росту.

Прадмюдаўскіх тэмпаў не здаваць

Пасьля 17-га МЮД прайшло каля 3-х тыдняў. Замест таго, каб з яшчэ большай настойлівасьцю працягваць работу па ператварэньні камсамольскай арганізацыі ў шматмільённую, шэраг калектываў і ячэек апынуліся ў палоне апартуністычнага самацёку і ў выніку, тэмпы росту, узятыя перад МЮД, ганебна здадзены. Так, калектыў цягі МБВ вырас на 6 чал., ФЗВ абутнікаў—на 9 чал., голкавай фабрыкі—на 2 чал., кіноўстаноў—3 чал.

Калектывы і ячэйкі фабрыкі „Прафінтэрн", шчацінной фабрыкі, аўтабазы, ТПД краўцоў за час з 1 га па 20-га верасьня прынялі ніводнага чалавека.

Асабліва дрэнна справа абстаіць на фанэрным заводзе, дзе налічваецца звыш 300 чалавек моладзі, а ў камсамоле ўсяго 80 асоб. У калектыве няма дасканалага вучоту камсамольцаў і нічога ня робіцца для далейшага росту арганізацыі.

Значна здалі тэмпы росту камітэты камсамолу: ф-кі «Сьцяг індустрыялізацыі», які перад МЮД толькі за жнівень вырас на 234 чал., а за верасень усяго на 24. Панчошная фабрыка пры росьце ў жніўні на 122 чал., пасьля МЮД дала 20 чал., „Дзьвіна"—44 чал., акулярная—10 чал., фабрыка імя Лекерта—4 чал.

Гэтыя лічбы сьведчуць аб тым, што кіраўнікі гэтых калектываў і ячэек зразумелі выкананьне дырэктыў аб росьце, як кампанію.

Неабходна зараз-жа разгарнуць масавую работу для таго, каб па баявому выканаць пастанову 9-га зьезду УсеЛКСМ з'такім разьлікам, каб сапраўды ператварыць у жыцьцё лёзунг аб шматмільённым камсамоле.

Гарком камсамолу павінен яшчэ больш удзяліць увагі пытаньням росту камсамольскай арганізацыі, забясьпечыць выкананьне пастановы IX зьезду УсеЛКСМ і X зьезду ЛКСМБ.

З.

Рыхтуйцеся да агульна-гарадзкой канфэрэнцыі навічкоў

Віцебская арганізацыя камсамолу зараз налічвае ў сваіх шэрагах каля 10 тысяч членаў, з якіх шмат зьяўляюцца навічкамі. Побач з далейшай працай па росту паўстае пытаньне замацаваньня ў арганізацыі ўлічшыхся новых тысяч рабоча-калгаснай моладзі.

Пры правядзеньні мерапрыемстваў, накіраваных для паляпшэньня працы з навічкамі, зараз усім калектывам і ячэйкам асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на падрыхтоўку агульна-гарадзкой канфэрэнцыі навічкоў, прызначанай на 1-га кастрычніка.

Напярэдадні гэтай канфэрэнцыі ўсім калектывам і ячэйкам камсамолу неабходна правесьці свае зьлёты з пытаньнем аб удзеле камсамолу і асабліва навічкоў ў падрыхтоўцы да 4-га квартэлу. Трэба прыстасаваць выступленьні старых бальшавікоў, камсамольцаў—удзельнікаў грамадзянскай вайны. Да зьлётаў неабходна падрыхтаваць выстаўкі і куткі, адбіваючыя ўдзел навічкоў у вытворчым і грамадзкім жыцьці. Гэтыя матар'ялы неабходна будзе потым прадставіць да агульна-гарадзкой канфэрэнцыі.

Партыйныя, прафсаюзныя і грамадзкія арганізацыі павінны аказаць камсамольскім арганізацыям штодзённую дапамогу ў падрыхтоўцы да зьлётаў канфэрэнцый на прадпрыемствах і да гарадзкой канфэрэнцыі. Неабходна, каб самі навічкі камсамольцы рапартавалі аб іх удзеле і працы ў камсамоле. Друк, мастацкія гурткі, ТРАМ і Трам'ядры павінны мабілізавацца на лепшае абслугоўваньне зьлётаў і канфэрэнцый навічкоў-камсамольцаў.

Падрыхтоўка да гарадзкой канфэрэнцыі павінна пачацца з групы і ячэйкі, уся праца якой павінна быць накіравана на мабілізацыю камсамольскай арганізацыі на перавыкананьне плянаў 4-га квартэлу, на камуністычнае выхаваньне навічкоў, на далейшую работу па 100-процантнаму ахопу рабочай моладзі камсамолам.

Канфэрэнцыя павінна будзе намеціць далейшыя формы працы з навічкамі, палажыўшы ў аснову замацаваньне маючыхся вынікаў і далейшае ўцягненьне рабочай моладзі ў камсамол.

Цырлін.

Займаюць дні вучобы

На панчошнай фабрыцы імя Клары Цэткін з мозая палітвучоба камсамолу зрываецца. 20-га верасьня павінны былі быць пешыя заняткі, але дзякуючы таму, што фабком занёў гэты дзень для правядзеньня сходаў у цэхох—вучоба сарвалася.

Гэтым пытаньнем павінен зацікавіцца партыйны калектыў, бо падрыхтоўчую працу, якую правёў камітэт камсамолу, пры такіх абставінах нельга замацаваць.

Рухмач.

Лятуноў вон з шэрагаў КСМ

У час разгорнутай барацьбы за ліквідацыю прарыву ў адставаньні бухгальтэры янавіцкіх арцеляў, калі ячэйка КСМ разьбіла рахункаводаў-камсамольцаў па самастойных арцелях, камсамолка **Бумагіна Г. М.** адмовілася ад работы і без дазволу ячэйкі і райкому КСМ паехала ў Віцебск.

Гарком КСМ павінен лятуна—рвача выкінуць з шэрагаў камсамолу.

Ганчароў.

МНОЖЦЕ ВОПЫТ УДАРНАЙ ШТОДЗЁНКІ

будзеце ініцыятыву рабселькораўскіх

ШТОДЗЁНКА ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ—ЛЕПШЫ ЗМ

ЎДАРНЫЯ ТЭМПЫ РАБОТЫ

Тэмпы патрабуюць

2-гі Ўсебеларускі зьезд рабселькораў у сваіх пастановах запісаў:

«Аперацыйныя, штодзённыя насьценныя газэты ў цэхах, штодзённыя насьценныя газэты, ілычоўкі, бюлетэні ў брыгадах, а таксама штодзённыя перасоўныя газэты ў часе палявых работ павінны бездакладна папоўніць друк у барацьбе за пабудову сацыялізму».

Выканаць задачу арганізатара масна штодзённае выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, штодзённа, з уласьцівай бальшавіком настойлівасьцю змагацца з усім тым, што перашкаджае нашаму паспяховаму сацыялістычнаму будаўніцтву, не пасілах насьценным газэтам, якія выходзяць раз у два тыдні і радзей.

Новым у рабоце нізавога друку становіцца аперацыйная штодзённая насьценная газэта ў цэху, зьмене, брыгадзе.

З мэтай дапамогі рэдкалегіям у арганізацыі выданьня штодзённых газэт у цэху, зьмене, брыгадзе, мы раскажам як з арганізацыйна тэхнічнага боку прыступіць да выданьня штодзённых газэт, скарыстоўваючы для гэтага багацейшы вопыт перадавых заводаў-гігантаў Савецкага саюзу.

Зьмест газэты

Выпушчаны рэдакцыяй газэты «Рабселькор» макет штодзёнкі «За работу па-новаму» вызначае яе асноўны зьмест—штодзённую барацьбу за рэалізацыю ў першую чаргу 6 гістарычных задач, якія пастаўлены тав. Сталіным.

Барацьба за рэалізацыю гэтых задач павінна быць канкрэтнай, увязанай з умовамі кожнага прадпрыемства, кожнага цэху, зьмены, брыгады паасобку.

Зьмест газэты абавязкова павінен быць канкрэтным. Калі ўказваецца на які-небудзь недахоп, на прычыну невыкананьня задач, пастаўленых тав. Сталіным, абавязкова трэба паказваць прозьвішчы вінаватых.

Асноўнае ў зьмесьце штодзённай газэты—аперацыйная зводка, дзе трэба адзначыць заданьне, якое павінна было быць выканана цэхам, зьменай, брыгадай. Побач з заданьнем паказваюць лічбамі і фактамі фактычнае яго выкананьне.

У аперацыйнай зводцы таксама адлюстроўваецца работа асобных брыгад, барацьба з цякучасьцю рабочай сілы, прагуламі і г. д.

Газэта павінна быць выпушчана з поўным мэтаімкненьнем. Напрыклад, чарговы нумар газэты прысьвечан пытаньню паляпшэньня бытавых умоў. Тады асноўная колькасьць заметак зьмешчаецца ў адпаведнасьці з вызначанай задачай.

На нязьмешчаныя заметкі ў газэце павінен давацца адказ у наступным нумары з паказаньнем прычын іх незьмяшчэньня.

На наступны дзень пасьля выпуску газэты трэба абавязкова праверыць ці зьнішчан паказаны ў заметцы недахоп.

Заметкі павінны быць невялічкімі, канкрэтнымі, зразумела напісанымі.

Праверку выкананьня і рэагаваньня па заметках праводзіць зьменная рэдкалегія, якая выпускае чарговы нумар.

Арганізацыя рэдкалегіі

Зойдуцца яшчэ і такія, што скажуць—«Выпускаць газэту штодзень? Эта немагчыма ў «нашых» умовах. Для гэтага патрэбна шмат людзей».

Цэлы рад іншых «раўважаньняў» мы будзем чуць ад маладушных элементаў. Мы іх павінны пабіць вопытам, які праверан на практыцы.

Гэты вопыт гаворыць, што выданьне газэты штодзёнкі на многа залежыць і ад падбору складу рэдкалегіі, арганізацыі яе работы, насычанасьці складу рэдкалегіі рабкорамі-ўдарнікамі, энтузіястамі справы.

Таму мы пытаньню складу рэдкалегіі штодзёнкі надаем вялікае значэньне.

Ад выразнай работы рэдкалегіі будзе залежаць ва многіх выпадках і перамога.

Група рабкораў заводу АМО (Масква), гаворачы аб вопыце работы штодзённай газэты «Стройка», якая выходзіць на буйнейшым будаўнічым вучастку, піша:

«У склад рэдкалегіі павінны ўваходзіць да 17 і больш чалавек. Рэдкалегія разьбіваецца на адказнага рэдактара, памочніка яго, тэхнічнага рэдактара і рад зьменных рэдкалегій.

Што такое зьменная рэдкалегія? Гэта брыгада з 3—5 членаў рэдкалегіі, якая выпускае газэту ў пэўныя дні. У адпаведнасьці з тым, што на вытворчасьці 5-ці ці 6 дзёўка, арганізуецца 5 або 6 зьменных рэдкалегій. Першая зьменная рэдкалегія выпускае газэту 1, 6, 11, 16, другая зьменная рэдкалегія выпускае газэту—2, 7, 12 і г. д. У кожнай зьменнай рэдкалегіі ёсьць і асоба, адказная за выпуск, якая мае непасрэдную сувязь з адказным і тэхнічным рэдактарам».

Агульная рэдкалегія са зьменнымі рэдкалегіямі пры выразна вызначаных на кожны дзень абавязках—заданьнях, у асноўным вырашае посьпех выпуску штодзёнкі.

Выпускаць штодзёнку пачынае пэўны склад рэдкалегіі. Пасьля выпуску некалькіх нумароў і замацаваньня выданьня штодзёнкі неабходна павялічыць склад рэдкалегіі да колькасьці 9, 13 і больш з тым, каб забясьпечыць нармальны яе выпуск і не перагружаць выданьнем газэты толькі 2—3 чалавек.

Трэба ня туваць зьменныя рэдкалегіі кожны дзень. Яны павінны мець цьвёрда вызначаны дзень выпуску газэт (раз у 5—3 дні).

Паміж зьменнымі рэдкалегіямі для забясьпячэньня рэгулярнасьці і якасьці выпусканых газэт, лепшай арганізацыі матар'ялу трэба арганізаваць сацыяборніцтва. Сацумовы павінны насіць канкрэтны характар.

Як арганізаваць матар'ял

Штодзёнка павінна выйсьці сёньня на заўтра. Яна пішацца і афармляецца пасьля работы. Для гэтага ў абедзены перапынак трэба наладзіць збор і арганізацыю матар'ялу.

Абедзены перапынак скарыстоўваецца для збору прамяной рабочых, збору заметак у вуснай (вусныя карэспандэнцыі запісваюцца ад імя рабочага членам рэдкалегіі), ці пісьмовай форме. У брыгадзіраў даведваюцца аб пэўнасьці і неабходных для зборкі дэталяй, матар'ялаў на заўтра. Пасьля гэтага ідуць да загадчыка цэху, які павінен сказаць, якую колькасьць і якіх дэталяй, матар'ялаў на заўтра ён дае. Загадчык цэху паведамляе рэдкалегіі аб задачах заўтрашняга дня, на падставе чаго і пішацца перадавая.

Вопыт газэты «Стройка» кажа:

«Матар'ял зьбіраецца з вынікаў рэйдаў, рапартоў, паставых, заметак насьценкораў, вусных карэспандэнцый».

З гэтага ўсяго відаць, што матар'ял для штодзёнкі—матар'ял арганізаваны, а не «самацёчнага характару».

Яго арганізатарам зьяўляюцца зьменныя рэдкалегіі.

Канкрэтна вызначае заданьне члену рэдкалегіі па зборы і арганізацыі матар'ялу, вырашае посьпех выпуску газэты.

Выданьне і тэхнічнае афармленьне газэты

Як-жа арганізаваць выданьне газэты? На гэта пытаньне дае адказ вопыт «Стройки».

«Выпуск робіцца зьменнай рэдкалегіяй вечарам пасьля работы, г. зн. газэту, якая прызначана на 29 ае, пішуць (і нават вывешваюць) 28 га вечарам. Пры выпуску новай газэты старую ня здымаюць, а зьнімаюць калі выйдзе 3-я газэта, так што заўсёды вісяць 2—3 нумары. Пры выпуску павінна быць дакладнае і цьвёрдае разьмеркаваньне абавязкаў, прычым усе выпускаючыя павінны падпарадкавацца адказнаму па выпуску».

Тав. Новаслянская («Серп і молат» Харкаў) кажа аб іх вопыце выданьня штодзённі наступнае:

«Газэту пішуць ад рукі 1—2 чалавекі. Мы прабавалі рабіць газэту калектыўна, мы прабавалі розныя мэтады і прышлі да перакананьня, што адзін—два таварышы зробяць гэта значна хутчэй і лепш.

Рэдкалегія ў поўным складзе зьбіраецца для абгаварэньня больш важных пытаньняў раз у пяцідзёўку або ў дэкаду. Тут жа складаецца і плян работы на бліжэйшы час. Рэдкалегіі (з 3—5 ца кожны дзень. Скажам, сёньня ... у газэце гасподар... заўтра—пытаньні ... бракам і г. д. За... чаецца, што пита... аб гасподарчым р... туе адзін тавар... —другі і г. д. Ко... канкрэтныя зада... тоўку, збор і пад... ялаў праводзім бр... дам. Непасрэдны... афармленьнем за... таварышы. Такую... робім зараз за 1—...

Афармлень...

У адносінах тэхнічн... ня газэты неабходна с... нае. Загалоўкі да зам... біць каляровымі алоўк... мантам Газэту можна... кі ці друкаваць заметк... цы. Зьвярнеце ўвагу на... насьць больш яркага ... газэты. Для гэтага н... ныя месцы рэм надк... пісаць каляровымі а... дзіць рамкай.

Асабліва ярка вызна... цыйныя зводкі з тым, б... ліся ў вочы. Чырвоны... кі можна рабіць у чы... най фарбах. Ш...рока... зьмяшчэньне фотаздым... ударнікаў, лепшых бры... ма лодыраў, рвачоў, ... гульшчыкаў.

Выпушчаны «Рабсел... сваёй мэтавай устаноў... ымі аддзеламі ў асноў... вае афармленьне газэ... ў макеце—аперацыйная... вочую і чорную дошкі зб... ня ня прозьвішчамі ... наго—двух лепшых ці ... няшняга дня работы. ... вішчамі абавязкова зьмя... вялічкая інфармацыя з ... тамі, якая паказвае, ч... шы рабочы зьмяшчаец... або чырвоную дошку.

Невялічкая інфармац... нам, прасьледуе мэту... шырокіх рабочых мас.

Аддзел «Нашы прапан... няецца прапановамі р... мой рэдкалегіі.

Незапоўненае месца... адводзім для іншых ка...

Перадавая пішацца ... баявой праграмы рабо... ным пытаньні, якое ... праведзена ў жыцьцё з...

Плян газэ...

Асаблівую ўвагу мы зв... на неабходнасьць пляна... рэдкалегіі.

Пытаньне аб пляне г... тучы месяц павінна б... на на нарадзе прадст... тыйных і камсамольскіх ... падарчых і прафэсыяна... нізацый.

Гэта нарада вызнач... таньняў, якія павінны б... ны газэтай. Гэты плян ... ходзячы з агульнага п... заводу, цэху, брыгады, ...

Апрача таго, рэдкалег... цоўвае на падставе агуль... тычнага) пляну дэкад... якім павінны быць канкр... чаны дні і паказана ка... на даручаецца правядзе... іншай работы, якімі мэт... ўдарных брыгад друку, ... рабочых, вусныя і пісьм... пандэнцыі і г. д.), арган... ці іншы матар'ял, фор... работы з рабкорамі і м... вядзеньня.

Сёньняшняя баявая ... калегій шматтыражак, ... газэт і ўсёй армі. рабкоў... бальшавіцкай настойл... чакаючы ніводнай хвіл... ажыцьцяўленьне пу ёў... беларускага зьезду ра... раў—за арганізацыю зы... дзённых газэт.

«Рабселькор»—С. І...

Зводка росту ...ных газэт па пад...емствах г. Віцеб...

1. «Сьцяг індустрыя...
2. «Чырвоны мэтал...
3. Дэпо чыгункі . . . 1
4. Ф-ка ім. Лекерта . 1

Арганізаваць штодзё... кожнай зьмене д...

24-га верасьня ў м... цэху дэпо МБВ чыгуні... арганізавана штодзёнка... сьцевая газэта. Ужо ... свайго існаваньня яна ... ныя дасягненьні ў ба... прамфінплян. Газэта ... пытаньне аб плянавым ... печаньні работы цэха і ... насьці з абточкай і ... канкрэтных вынікаў ... напрамку, таксама га... маглася выкананьня п... аб пастаноўцы паравоз... монт і павяла жорст... рацьбу з абазьлічкай, ... чаго зьмены і рабочы... цаваны за станкамі.

Гэта дасягнута дзяк... му, што адміністрацыя, ... ныя і прафсаюзныя ар... сваечасова рэагуюць на ... зьмешчаныя ў газэце, ... ма і ажыцьцяўляюць ... вы рабочых.

Вопыт штодзёнкі мэх... цэху павінен быць р... джаны на астатнія цэхі ... ны дэпо.

Рэдактар штодзёнкі

Мен...

Конкурс на лепшую сталоўку пад пагрозай зрыву

БУЙНЕЙШЫЯ СТАЛОВЫЯ—17-я, 25-я і 1-я НЯ ЎКЛЮЧЫЛІСЯ Ў КОНКУРС

Аб конкурсе ня ведаюць

У сталоўцы № 1 ВЦРК, якая абслугоўвае студэнцтва, да 15 верасьня працаўнікі сталоўкі на чале з старшынёй мясцкому ня ведалі, што праводзіцца конкурс на лепшую сталоўку.

Прамфінплян у сталоўцы выконваецца толькі на 50 проц. У скаргавых кнігах маецца шмат скаргаў, на якія ніхто не рэагуе. У сталовай пануе антысанітарыя, нягледзячы на тое, што там ёсьць урач.

Чаргі яшчэ ня зьнішчаны. З агульнага ліку 104 працаўнікоў сталоўкі ударнікаў налічваецца ўсяго 29. Абязьлічка ў рабоце сталоўкі яшчэ не ліквідавана.

Адкіды ў сталоўцы належным чынам не скарыстоўваюцца. У той час, насі не хапае мэблі, паламаная мэбля ляжыць у падвале, а не рамантуецца.

Брыгада: Субоцін, Бізуноў, Холкін.

«Чырвоны мэталіст» рэалізуе пастанову ЦК УсеКП(б)

Рабкораўская брыгада заводу сумесна з прадстаўнікамі рэдакцый газэт «Рабселькор» і «Віцебскі Пралетары», праўленьня ЗРК і БКС распрацавала канкрэтныя мярапрыемствы для паляпшэньня працы сталоўкі.

З 1-га кастрычніка ўводзіцца сыстэма прыгатаўленьня блюд рознае цаны Буфэт вылучаецца ў самастойную адзінку.

З 1-га кастрычніка сталоўка і буфэты пераводзяцца поўнасьцю на гаспадарчы разрахунак і зьдзельшчыну. Брыгада зьвярнула ўвагу паваро ў на неабходнасьць прыняцьця ад кладаўшчыка выключна добраякасных прадуктаў і ў нормах, вызначаных Наркамснабам.

На сёньняшні дзень маецца значны пералом у бок якаснага палепшаньня адпускаемых абедаў. Наладжан нагляд за гэтым з боку ўрача і грамадзкасьці заводу.

Сталоўка—цэх харчаваньня—на «Чырвоным мэталісьце» у цэнтры ўвагі.

Брыгада: Бэрсон, Раськіна і Ліцьвякоў.

У сталоўцы № 17 спасылаюцца на „аб'ектыўныя" прычыны

За апошні час сталоўка № 17 не давыконвае свой прамфінплян. Сталоўка мае ўсе магчымасьці для перавыканаўваньня ўсіх відаў працы на зьдзельшчыну, але па «аб'ектыўных» прычынах — як кажа загадчык сталоўкі тав. Найдзін — яшчэ не перайшла. Адгэтуль ураўнілаўка і інш. «прелесці».

Меліся факты знаходжаньня ў абедах цьвікоў і інш. рэчаў. Ня гледзячы на тое, што ў сталоўцы маецца памяшканьне для захоўваньня прадуктаў, апошнія знаходзяцца на дварэ, дзе ў большасьці выпадкаў псуюцца—і на гэта ніхто не рэагуе.

Разностайнасьці абедаў яшчэ няма, кожны дзень абеды амаль адмолькавыя. Сталоўка знаходзіцца ў антысанітарным становішчы: на кухні бруд, мяса нічым ня прыкрываецца ад мух і г. д.

Рабочага кантролю над сталоўкай зусім няма.

Кожны дзень падаюцца скаргі на дрэнную якасьць абедаў, але ніякіх захадаў да палепшаньня ня прымаецца.

Сталоўка амаль ня ўдзельнічае ў правядзеньні конкурсу на лепшую сталоўку гораду.

Далей так працягвацца ня можа. Недахопы ў працы 17-й сталоўкі павінны быць тэрмінова зьнішчаны.

Брыгада: Варчон, Усысмін, Напысні, Бэрэмбаум і Фрэйдзон.

Антысанітарыя і абязьлічка ўсё яшчэ ў пашане

Сталоўка № 25 абслугоўвае фку імя Лекерта, завод «Камінтэрн», друкарню і яшчэ некалькі дробных прадпрыемстваў.

З 76 працаўнікоў сталоўкі ўдарнікамі лічыцца 40, але сапраўдных ударнікаў мала. Нягледзячы на тое, што працаўнікі сталоўкі разьбіты на брыгады, але абязьлічка яшчэ ня зьнішчана. Санітарны мінімум у сталоўцы праводзіцца слаба.

Калі запыталі загадчыка сталоўкі: „Як вы скарыстоўваеце адкіды ад абедаў», ён адказаў, што «мы здаем іх у другія сталоўкі, дзе маюцца сьвінабазы». Калі-ж брыгада выйшла на двор, дык убачыла на сьмяцьцёвай кучы шмат пасаваных салёных гуркоў. У сталоўцы назіраецца вялікая чарга за абедамі на дом. Абеды на прадпрыемствы дастаўляюцца ў тэрмасах, якія дрэнна зачыняюцца і ў выніку тлустасьць у дарозе выліваецца, а абеды робяцца поснымі.

Адміністрацыі сталоўкі трэба тэрмінова ліквідаваць паказаныя недахопы і ўключыцца ў конкурс на лепшую сталоўку.

Брыгада: Яноўскі і Барыноўскі.

Грубасьць і нядбайнасьць

Па Вакзальнай вул. знаходзіцца гарбатня ЦРК № 1. Гэта гарбатня лічыцца культурнай, што да некаторай ступені адпавядае сапраўднасьці: пры ўваходзе трэба распранацца, памяшканьне чыстае, віднае.

Але зусім некультурна вядуць сабе афіцыянткі і нават сама загадчыца гарбатні, з іх боку наглядаюцца грубыя адносіны да наведвальнікаў, кепскія адносіны да сваіх абавязкаў і г. д.

Мясцком гарбатні павінен мабілізаваць грамадзкасьць вакол гэтага.

Неабходна ўставіць сталы рабочы кантроль у гарбатні.

Трэба зрабіць так, каб гарбатня ЦРК № 1 стала сапраўды культурнай.

Першоў.

Палепшыць харчаваньне ФЗВ абутнікаў

Кепска абслугоўваюцца харчаваньнем вучні ФЗВ абутнікаў.

Абеды якія дастаўляюцца з сталоўкі № 25, у большасьці бываюць дрэннай якасьці і тых не хапае. На 270 чал. прывозяць 100 абедаў. У абедзе ня рэдкасьць—чарвяк, кусок вяроўкі і інш. брыдкасьці.

Памяшканьне сталоўкі вельмі цеснае і брудное, пасуды не хапае.

ЦРК неабходна прыняць усе захады да зьнішчэньня гэтых недахопаў.

Цырульнікаў.

Чаргі яшчэ ня зьнішчаны

У сталоўцы акулярнай ф-кі заўсёды вялікія чаргі з за недахопу патрэбнай колькасьці пасуды і афіцыянтак, што вельмі нэрвуе рабочых. Пасуда мыецца дрэнна. Санмінімум ня выконваецца.

Трэба зараз-жа, каму належыць, зьнішчыць усе недахопы ў працы сталоўкі і чым хутчэй, тым лепш.

Др Васільева.

На акулярнай фабрыцы

Не 61, 38, а 100% павінна быць вынікам штурму

60 працадзён прагулаў у пяцідзёнку ў шліфавальным цэху, прастоі, фармальны перавод на гаспадарчы разьлік, абязьлічка—трымае фабрыку ў цянётах прарываў

61,38 проц. выкананьня пляну дае акулярная фабрыка

Выкананьне прамфінпляну за два з паловай месяцы 3-га квартэлу па акулярнай фабрыцы сыгналізуе аб пагражаючым становішчы. **План выканан на 61,38 проц.**

Асноўнымі прычынамі нявыкананьня пляну зьяўляюцца: адсутнасьць фатаграфій рабочых працэсаў, прастой такарных варштатаў на другой і трэцьцяй зьменах з за адсутнасьці патрэбнай колькасьці токараў, няўвязкі ў рабоце падрыхтоўчага цэху.

Зараз на ф-цы праводзіцца работа па складаньні прамфінпляну на 4-ы квартал і на 1932 год. Складаньне пляну распачата несвоечасова, так як аб'яднаньне недасылала кантрольных лічбаў. План на 4-ы квартал сярод рабочых яшчэ не абгаварваўся. ІТР ніякага ўдзелу ў складаньні прамфінпляну ня прымае. Як і ў мінулых плянах, у прамфінпляне на 4-ы квартал не прадугледжаны рацыяналізатарскія мерапрыемствы.

Ф-ка павінна зараз-жа сапраўды па ўдарнаму мабілізавацца на ліквідацыю адставаньня. Прамфінплян 4 га квартэлу неабходна зараз-жа перанесьці на абгаварэньне рабочых сходаў, мабілізаваць масы на высоўваньне сустрэчных плянаў, рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў.

Ф-ка мае ўсе магчымасьці выконваць свае праграмныя заданьні і яна павінна іх выканаць.

С. Б—й.

Ударнікі акулярнай аб прычынах прарываў

Цякучасьць рабсілы і прагулы—асноўная прычына прарываў

У параўнаньні з мінулымі месяцамі шліфавальны цэх акулярнай фабрыкі сыравінай забясьпечаны поўнасьцю, але прамфінплян ня выконваецца. Асноўныя прычыны крыюцца ў цякучасьці рабочай сілы і прагулах, дасягаючых да 60 працадзён у пяцідзёнку. Барацьбы з гэтым злом амаль не вядзецца. На выкананьні прамфінпляну таксама адбіваецца адсутнасьць сухой спэцвопраткі, бруд у цэху і г. д. Падрыхтоўцы кадраў у цэху ўвагі ніякай не ўдзяляецца. Майстры не зацікаўлены ў абучэньні вучняў, так як за гэта яны нічога не атрымліваюць. Пункты калдагавору па гэтаму пытаньню ня выконваюцца. Рабочыя не мабілізаваны на зьнішчэньне прарываў.

Царкоўскі.

Парт'ячэйка не стаіць на чале штурму

Партыйная ячэйка не стала на чале ўсёй работы па штурму прарыву. Адміністрацыя ф-кі ніякай дапамогі ў арганізацыі работы ў цэху не аказвае. Гаспадарчы разрахунак уведзан фармальна. Пастанова бюро парткалектыву аб штурме выконваецца дрэнна, работа праходзіць самацёкам. Цэхавы камітэт бязьдзейнічае.

Хацінскі.

Р—бацькаўшчына сусьветнага пралетарыяту

і ў СССР і яго фарпосьце—Савецкай Беларусі—працоўныя нацменшасьці маюць магчымасьці гаспадарчага і культурнага разьвіцьця

Справа беларусізацыі—першачарговая задача

...жыве нацпа-...тыка партыі Леніна!

...ныя палякі заводу «Чырвоны мэталіст», заслухаўшы інф...ю аб пануючым у Польшы ...кім тэрары, ганьбуюць польскіх катаў, якія сваімі ...паказваюць усяму сьвету ...цыю жудасьцяў сярэдніх ...польскі фашызм з прычыны ...ка крызысу, палохаючыся ...цельнага руху рэвалюц йных ...у вёскі—сотнямі і тысячамі, ...турмы лепшых прадстаўні...ю ...ю ...ага пралетарыяту і ...на Польшчы, Заходняй Бела...ходняй Украіны.

...ючы свой голас пратэсту ...разгулу белага тэрору ...ы заклікаем сваіх братоў ...моцна трымацца і яшчэ ...парта, пад сьцягамі Кам'...магацца за перамогу прале...рэвалюцыі.

...ілком і поўнасьцю ада...цыянальную палітыку ...партыі, якая забясьпечы...забясьпечвае гаспадарчы ...рост працоўных ...нацыянальнасьцей.

...цягваючы, праз мяжу, ру...рскага падтрыманьня да вас, ...беларускія, украінскія ра...сяляне, прыгнечаныя пад ...льскага фашызму,—заяўля...толькі ўлада саветаў здоль...нечыць выхад з крызысу і ...сацыялістычнай грамады.

...укі фашысцкіх катаў ад ра...нага пралетарыяту Поль...годняй Беларусі і Заходняй

...сьвіе і перамагае ленінская ...ная палітыка!

...ы ня верым ...сьні капіталі...стых"

...ру аб Савецкім ...зе мы нясем у ...ы рабочых мас»

...ушы ў СССР, у горад Ві...магу не падзяліца з рабо...ны дыктатуры пралетарыя ...ановішчы «счастливой» Амэ...ую краіну, як і ўсе іншыя ...тычныя, апанаваў глыбокі

...ак, характарызуючы Амэры...—гэта сотні самагубстваў ...та, каб не памерці галод...рою. Рабочыя кварталы за...галодными абязьсіленымі ...ными. У краіне «свабоды ...абаронена работаму заявіць ...о слова ў сваю абарону. ...сьлёзатачивы газ у руках ...прымушае маўчаць. Але ...учым. Праўду аб Савецкім ...бацькаўшчыне працоўных ...ў гушчу рабочых мас.

...ню Ёрку і іншых гарадоў ...х Штатаў наглядаюць вы...калі бацькі забіваюць сваіх ...і сябе, каб не дачакацца ...д голаду. Мільёны беспра...находзяцца ў вельмі цяжкім ...ны.

...ю, якую сеюць жыраючыя ...тыя, мы і служэць на хочам.

...Злучаных Штатаў як ...нуць на абарону СССР, ...кі хто-небудзь адважыцца ...пасьці.

...то я ўбачыла сваімі вачы ...СР, перавышае ўсялякія ме...бе толькі тут ёсьць сэнс ...поўная роўнасьць працоў...нацыянальнасьцяў.

Дора Кан.

Выклік рабкораў панчошнай прыняты

На «Сьцягу індустрыялізацыі»

Мы, рабкоры-ударнікі швэйн й фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі» выклік рабкораў панчошнай фабрыкі прымаем, пры чым бярэм на сябе абавязацельства вывучыць і ўжываць белмову і акуратна наведваць гурток.

Выклікаем пасьледваць нашаму прыкладу астатніх рабкораў і рабочых фабрыкі.

Жук, Масарскі, Бумштэйн, Ліўшыц, Татарынаў, Гайсёнак, Зэліксон, Ліпнік, Альтман, Грубенка, Клубман, Фейгіна, Ізраіль

На чыгунцы

Мы, рабкоры-ударнікі рабочыя чыгункі, улічваючы тое, што беларусізацыя зьяўляецца в жнейшым зьвяном у нацкультбудаўніцтве, бярэм на сябе абавязак на працягу 3 х месяцаў вывучыць белмову і ўжываць яе ў штодзённым жыцьці.

Выклікаем усіх рабкораў ударнікаў чыгуначнага вузла.

Майораў, Увараў, Х нін, Азарэнкаў, Васирасенскі.

Савецкі Саюз—мая бацькаўшчына

(Гутарка з работніцай панчошнай фабрыкі, толькі зьвярнуўшайся з падарожжа па Эўропе)

У 1919 годзе я прыехала з Латвіі. З 1921 году працую на вытворчасьці. За гэтыя 10 год я ўбачыла, што Савецкай уладай праароблена вялікая работа па перавыхаваньні прыгнечаных раней пры царскім строі нацыянальных меншасьцяў.

Мне далі магчымасьць выявіць сябе ўдарнай работніцай, за што я была прэміявана паездкай за мяжу. Я наведала Нямеччыну, Ангельшчыну, Турцыю.

У гэтых капіталістычных краінах іншыя нацыянальнасьці прыгнечаны, забіты. Капіталісты натраўліваюць адну нацыю на другую, для нацыянальных меншасьцяў адведзены асобныя кварталы, дзе ксяндзы, рабіны і папы праводзяць палітыку капіталізму—сеюць нацыянальную варожасьць з мэтай паслабленьня ўвагі рабочае клясы ад барацьбы за вызваленьне.

Толькі ў Савецкім Саюзе працоўныя нацыянальных меншасьцяў маюць магчымасьць прымаць актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве адзінай краіны дыктатуры пралетарыяту.

Бесэйна.

Мы павінны быць у першых шэрагах па ажыцьцяўленьню ленінскай нацпалітыкі

Прайшоўшы, з часу пастановы бюро ЦК і ЦКК КП(б)Б, больш чым двухмесячны тэрмін, яшчэ ня даў патрэбнага зруху ў справе ліквідацыі па Віцебссу глыбокага прарыву ў ажыцьцяўленьні ленінскай нацпалітыкі. Як адзначае партактыў у сёньня зьмяшчаемай рэзалюцыі, мы не дабіліся патрэбных зрухаў таму, што ўвага ажыцьцяўленьню нацпалітыкі зусім недастатна.

Пралетарскі Віцебск, дзякуючы нацыянальнай палітыкі партыі, з кожным днём індустрыяльна ўзрастаючы, убіраючы ў сабе ўсё новыя і новыя пласты рабочых, карэнізуючы рабочы кляс гораду, можа і павінен выйсьці з прарыву, арганізуючы масавы паход за аўладаньне беларускай мовай, белаускай пралетарскай культурай, што яшчэ больш узмацніць кіруючую ролю пралетарыяту ў будаўніцтве сацыялізму ў БССР—неадлучнай часткі Саюзу саветаў.

У гэтым нам дапаможа і сёньняшняе выязднае пасяджаньне цэнтральнай нацыянальнай камісіі пры ЦВК БССР.

ПАЛОНЬНІКІ ПОЛЬСКАГА ФАШЫЗМУ

ГЭРАІЧНА ЗМАГАЮЦЦА СУПРОЦЬ АБНАГЛЕУШАГА РАЗГУЛУ ФАШЫСЦКАЙ ДЫКТАТУРЫ

Палітвязьні стойка змагаюцца

ВАРШАВА, 24. Як падае «Ілюстраваны курэр цодзенны» ад 23 верасьня ў панядзелак, 20 гэтага месяца, раніцою палітвязьні мыславіцкай турмы (Мыславіцы—прамысловы цэнтр у Верхняй Сілезіі) ня прынялі харчоў, якія ім прынесьлі, міскамі выбілі шыбы і выкінулі міскі праз вокны, а той-жа самай гадзіне началася галадоўка ў катавіцкай турме (Верхняя Сілезія).

Палітвязьні стойка працягваюць галадоўку.

Масавы рух салідарнасьці у Эўропе і Амэрыцы

БЭРЛІН, 24. Весткі з Польшчы аб пераводзе палітзьняволеных на крымінальны рэжым і зьверскіх зьдзеках польскіх турэмшчыкаў над палітвязьнямі ўсхалыхнулі працоўныя масы Эўропы і Амэрыкі.

У БЭРЛІНЕ адбыўся шматлюдны мітынг пратэсту супроць фашысцкага тэрору ў Польшчы. Паліцыя заняла ўсе выхады, абыскваючы ўдзельнікаў. Такія ж мітынгі адбыліся і ў іншых гарадох Нямеччыны. На сходах прымаюцца рэзалюцыі пратэсту, якія будуць перасланы польскаму ўраду. Нямецкія рэвалюцыйныя арганізацыі зьвярнуліся з адозвай з позаду разгулу тэрору ў Польшчы.

Масавыя сходы пратэсту супроць зьверства польскага фашызму адбыліся ў **Аўстрыі**: у Вене, Грацэ і Рэйхенбэрге.

У ПАРЫЖЫ адбыўся грандыёзны мітынг пратэсту, скліканы камуністычнай фракцыяй парламэнту. Масавыя сходы і дэманстрацыі пратэсту, у якіх прынялі ўдзел таксама італьянскія і польскія працоўныя, якія працуюць у Францыі, адбыліся ў Рубэ, Дуэ і іншых мясцох. У Дуэ адбылася дэманстрацыя перад будынкам польскага консульства. ЦК унітарнай канфэдэрацыі працы паслаў тэлеграму польскаму пасольству ў Парыжы, патрабуючы спыненьня распраў над польскімі палітзьняволенымі. У многіх мясцовасьцях адбыліся мітынгі і дэманстрацыі ў абарону польскіх палітзьняволеных. З **Барселёны** паведамляюць, што гішпанскія працоўныя пратэстуюць супроць прасьледваньняў рэвалюцыйных барацьбітоў у Польшчы.

У ДЭТРОЙЦЕ (ПАЗШ) адбылася 15 тысячная дэманстрацыя пратэсту супроць расправы над польскімі палітзьняволенымі.

Сыны зьдзекі над нашымі братамі па клясе

Агульны сход рабочых каапгасу «Яна-поль» рашуча пратэстуе супроць зьдзекаў над палітзьняволенымі ў турмах фашысцкай Польшчы.

Таварышы зьняволеныя! Памятайце што мы з вамі і што недалёк той час, калі мы сумесна з вамі пасадзім на лаву падсудных вашых катаў.

Мы рашуча патрабуем спыніць зьдзекі над нашымі братамі.

У адказ на ўвядзеньне новага фашысцкага турэмнага рэгляменту і ваенна палявых судоў уносім у фонд дапамогі палітзьняволеным і іх сем'ям 200 рублёў.

Выклікаем усе сельсаветы Віцебскага раёну

Заслухаўшы даклад аб зьдзеках над палітзьняволенымі ў Польшчы, пашыраны прэзыдыум Віц. сельсавету пратэстуе супроць увядзеньня новага фашысцкага закону над палітзьняволенымі, супроць зьдзекваньняў над лепшымі сынамі рабочае клясы Польшчы, знаходзячыхся ў турмах панскай Польшчы.

Мы абязуемся ўсім уступіць у члены МОПР і разгарнуць інтэрнацыянальную работу сярод калгасьнікаў нашага с/с.

Уносім у фонд дапамогі палітзьняволеным 20 руб. і выклікаем пасьледваць нашаму прыкладу ўсе сельсаветы Віц. раёну.

Ніводнага калгасьніка па за шэрагамі МОПР

Мы—калгасьнікі і аднаасобнікі, сумесна з настаўнікамі і вучнямі Рудакоўскага с. с., з абурэньнем пратэстуем супроць катаваньняў у фашысцкіх польскіх турмах, супроць белага тэрору і падрыхтоўкі нападу на Савецкі Саюз. Мы заклікаем усе працоўныя масы згуртавацца навакол камуністычнае партыі і заклікаем пралетарыяў Польшчы і інш. капіталістычных краін яшчэ рашучай змагацца за дыктатуру пралетарыята.

Мы бярэм на сабе абавязак разгарнуць сацспаборніцтва і ўдарніцтва, пасьяхова скончыць уборачную кампанію і восеннюю сяўбу, узьняць работу на рэалізацыі навукі і палепшыць працу ячэек МОПР.

Ніводнага калгасьніка і аднаасобніка за шэрагамі МОПР.

Сход пастанавіў разгарнуць збор сродкаў у карысьць зімовай кампаніі дапамогі палітзьняволеным.

Чыгуначнікі пратэстуюць

Усё ўзмацніўшыйся тэрор у капіталістычных краінах супроць рэвалюцыйнага руху, узьняў сярод рабочых вузла ст. Віцебск хвалю пратэсту. У сваіх рэзалюцыях рабочыя выносяць пастановы аб аднапрацэнтнымадлічэньні з месячнага заробку у фонд МОПР, уступленьнем у шэрагі МОПР (дэпо), адлічэньнем аднадзённага заробку ў карысьць палітзьняволеных, ліквідаваньнем запазычанасьці па сяброўскім узносам (ахова МБВ).

Чыгуначнікі абяцаюць яшчэ больш разгарнуць сацспаборніцтва і ўдарніцтва, узьняць вытворчасьць працы і ліквідаваць прарывы на асобных вучастках вузла.

Супроць фашысцкага тэрору

Агульны сход калгасьнікаў калгасу «Зімасточча» пратэстуе супроць бешага тэрору ў Польшчы над змагарамі за вызваленьне працоўных з-пад гнёту капіталу.

Калгасьнікі ўносяць у карысьць палітзьняволеных 50 р. і пастанавілі ўсім, як адзін уступіць у члены МОПР.

Выклікаем пасьледваць нашаму прыкладу ўсе калгасы Зімасточчага сельсавету.

Конкурс на лепшы ФЗВ

ПРЫЙСЬЦІ ДА ФІНІШУ ЛЕПШЫМІ—ГОНАР КОЖНАГА ФЗВ

ГАРПРАФСАВЕТ І ЦРК ПАВІННЫ ПАВЯРНУЦЦА ТВАРАМ ДА ПАДРЫХТОЎКІ КВАЛІФІКАВАНЫХ КАДРАЎ

Зьнішчыць недахопы ў рабоце ФЗВ будаўнікоў

ФЗВ зьяўляецца галоўнай крыніцай пралетарскіх кваліфікаваных кадраў для нашай прамысловасьці. Але ня ўсе ФЗВ знаходзяцца ў адноль...ных умовах.

У рабоце ФЗВ будаўнікоў маюцца некаторыя дасягненьні. У па...обных цэхах уведзена мэханізацыя, маецца шэраг ударных брыгад, ударныя брыгады смалярнага і каменнага цэху паказалі добрыя прыклады работы ня толькі ў сябе на пабудове, але і на торгараспрацоўках за што шэраг лепшых ударнікаў былі прэміраваны. У пасаб...ных цэхах арганізаваны насьценныя газэты, маецца школьная насьценная газэта і г. д.

Побач з гэтымі дасягненьнямі маецца шэраг недахопаў.

Навучальны год знаходзіцца пад пагрозай зрыву, бо неадрэхтавана памяшканьне. Ня зусім добра абстаіць справа з падборам настаўнікаў. Дрэнна працуюць пасобныя цэхі. Сьлясарны цэх, які працуе ў галіне Белдзяржбуду, ня мае належных інструментаў і патрэбных матар'ялаў. Акрамя таго ён знаходзіцца ў такім цесным памяшканьні, што калі працуюць 15 чалавек, няма дзе павярнуцца. Бываюць выпадкі, калі вучняў скарыстоўваюць, як чорнарабочых.

У сьлясарным і апальным цэхах частыя прастоі з-за недахопу матэрыялаў. Працыпліна ў апальным цэху на ...ым пункце, часта вучні ідуць на абед да звяка. Інструктары адносяцца да працы па-кабінэтнаму, спазьняюцца, пакідаюць вучняў без работы.

У сталярным цэху з-за таго, што не ўрэгулявана пытаньне з асьвятленьнем, вучні 2-й зьмены кансаюць работы на гадзіну альбо паўтары раней. У памяшканьні майстэрняў не адчуваецца гаспадарчага вока. Вокны выбіты, і з наступленьнем халадоў становіцца немагчыма працаваць.

Зусім не адчуваецца ў будоўчых працах грамадзкіх і прафсаюзных арганізацый. За апошні час у члены прафсаюзу прынятыя толькі 60 чал. Ячэйкі МОПР, ТДА, віахэму і інш. бязьдзейнічаюць. Тэхнічныя гурткі не працуюць. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва амаль не разгорнута. Прымітыны фонд марыцуюць.

ФЗВ будаўнікоў павінен неадкладна ўключыцца ў конкурс, абвешчаны гаркомам КСМ і рэдакцыяй «Віцебскі Пралетарый». Пытаньні капітальнага будаўніцтва, якія зьяўляюцца самым вузкім месцам у рабоце ФЗВ, павінны быць зараз вырашаны.

На аснове шырока разгорнутага сацспаборніцтва і ўдарніцтва, недахопы, якія маюцца ў практычнай і тэарытычнай вучобе, павінны быць зьнішчаны.

Бенсман І. Валічка А.

Уключаемся ў конкурс

ФЗВ чыгуначнікаў уключыўся ў конкурс на лепшы ФЗВ. Абрана брыгада, якой даручана распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па правядзеньні конкурсу ва ўмовах ФЗВ.

Брыгада ўжо прыступіла да работы.

У час конкурсу вучні і выкладчыкі абавязваюцца зьнішчыць усе недахопы, якія маюцца ў рабоце ФЗВ.

Г.

Каапэрацыя аб забесьпячэньні ФЗВ не клапаціцца

Падрыхтоўка кваліфікаваных кадраў для нашай прамысловасьці адыгрывае вялікую ролю, асабліва ва ўмовах Віцебску, дзе прамысловасьць за апошні час значна ўзрасла.

Нягледзячы на гэта, грамадзкія і каапэрацыйныя арганізацыі да апошняга часу яшчэ не аддаюць належнай увагі гэтаму вучастку.

Большасьць ФЗВ (будаўнікі і інш.) зусім дрэнна забясьпечаны харчаваньнем. Тамжа, дзе маюцца свае сталоўкі (швэйнікі і інш), апошнія знаходзяцца ў антысанітарным становішчы, на якасьць харчаваньня ўвагі не зьвяртаецца.

Яшчэ горш абстаіць з забесьпячэньнем вучняў ФЗВ прыладамі. Калі ФЗВ, прымацаваныя да зачыненых разьмеркавальнікаў, забясьпечваюцца хоць у трэцюю чаргу (швэйнікі), дык ФЗВ дарбудаўчу і будаўнікоў амаль зусім не забясьпечваюцца. Каапэрацыйныя арганізацыі павінны ў час конкурсу распрацаваць шэраг канкрэтных мерапрыемстваў па палепшаньні забесьпячэньня ФЗВ

Трэба павярнуцца тварам да падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў. Брыгада: Рэўд, Мядзьведзяў.

У ФЗВ чыгуначнікаў калдагавор ня выконваецца

Для праверкі калдагавору ў ФЗВ чыгуначнікаў былі створаны 6 брыгад: па гаспадарчаму разрахунку, па праверцы становішча працдысцыпліны, па сацспаборніцтву, ударніцтву і культурным жыцьці школы, па грамадзкаму харчаваньню і забесьпячэньню прыладамі і вытворчай работы школы.

У такіх арганізацыях, як МК, вучпрафсаюз, аддзел кадраў калдагавору зусім не аказалася.

Брыгадай па праверцы працоўнай дысцыпліны ўстаноўлена, што меліся прагулы з боку вучняў, інструктароў і настаўнікаў. Часта былі прастоі ў майстэрні з-за недахопу інструментаў. Меліся выпадкі, калі з-за адсутнасьці належнага кіраўніцтва вучні працавалі 3 гадзіны замест 4 х, пакідалі лекцыі бяз ведама настаўніка. З боку часткі вучняў групы „Б" назіраюцца дрэнныя адносіны да інструктароў і настаўнікаў.

Усяго ў ФЗВ налічваецца 50 ударных брыгад, але гэтыя брыгады толькі па школе, на вытворчасьці іх няма.

Па новаму калдагавору вучні павінны атрымліваць пэнсію 2 разы ў месяц, але адміністрацыя не клапаціцца аб своечасовай выдачы пэнсіі. Заробак выдаецца не па тарыфу новага калдагавору, а па старых стаўках. Спэцвопратка і спэцмыла выдаюцца несваечасова.

На рабоце вытворчасьці адбываецца невыкананьне падсобнымі цэхамі заказаў вучняў, неплянавае забесьпячэньне хадавымі матарыяламі, адсутнасьць скрынак для інструментаў.

Адміністрацыя дэпо да гэтага часу ня прымае належных захадаў да зьнішчэньня выпадкаў кражы і зьнікненьня частак ад паравозаў ФЗВ.

Брыгады намецілі шэраг канкрэтных мерапрыемстваў, якія павінны забясьпечыць зьнішчэньне выяўленых недахопаў.

У зьвязку з уключэньнем ФЗВ у конкурс на лепшы ФЗВ неабходна пры выпрацоўцы ўмоў конкурсу ўлічыць вывады брыгад і мабілізаваць увагу вучняў і ўсіх арганізацый на ліквідацыю недахопаў.

Дварсон, Ионюхаў.

Гарпрафсавет ня выканаў пастаноў 1-ай канфэрэнцыі ФЗВ

Аб пастановах першай канфэрэнцыі ФЗВ, якая адбылася ў сакавіку 1931 году, дзе было вызначана шэраг канкрэтных мерапрыемстваў па палепшаньню кіраўніцтва прафсаюзных арганізацый работай ФЗВ—у гарпрафсавеце нават ня ведаюць.

Гарпрафсавет пытаньнем падрыхтоўкі кадраў для прамысловасьці праз ФЗВ амаль не займаўся. На працягу апошняга часу стаяў толькі адзін раз на прэзыдыуме ГПС даклад аб жнівеньскім наборы ФЗВ але як выканана гэта пастанова, праваўніі гарпрафсавету ня ведаюць. Пытаньнем палепшаньня бытавых умоў ФЗВ гарпрафсавет не займаўся.

Капітальнае будаўніцтва ФЗВ зьяўляецца адным з самых вузкіх месц, але гарпрафсавет абмяжоўваўся прыняцьцем пастаноў і нічога канкрэтнага не зрабіў.

Усе гэтыя факты сьведчуць аб тым, што гарпрафсавет не даацаніў аднэй з важнейшых галін забесьпячэньня выкананьня прамфінпляну—падрыхтоўкі кадраў. Брыгада: Зэвін, Собоці, Пэўлаў.

АГЛЯД ДРУКУ

„На сёньняшні дзень справа абстаіць вельмі дрэнна"

Шматтыражкі «Мэтпромавец», «Прафінтэрнавец» і «Чырвоная акулярніца»

Бюро ЦК і прэзыдыум ЦКК КП(б)Б у сваёй пастанове адзначылі аб самым глыбокім прарыве ў рабоце віцебскай арганізацыі, у правядзеньні ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Гэтая характарыстыка і на сёньняшні дзень жыцьцёва. Пастанова ЦК і ЦКК, канкрэтызаваныя мерапрыемствы гарадзкога камітэту партыі ў значнай колькасьці месц не праламляюцца «таму, што **увесь партыйны актыў яшчэ не узяўся належнымі тэмпамі за іх выкананьне**». (З рэзалюцыі сходу партактыву).

Рашэньне кастрычнікаўскага пленуму ЦК КП(б)Б 1930 году аб значным адставаньні Віцебшчыны ў ажыцьцяўленьні нацпалітыкі партыі пастанова бюро ЦК і ЦКК павінны былі канцэнтраваць увагу усяго друку гораду на мабілізацыі мас на ліквідацыю адставаньня, перашоўшага ў глыбокі прарыў.

«Прафінтэрнавец» 13 га жніўня расказвае аб тым, што работніца Ратава паказала свой антысэміцкі твар. **«Чырвоная акулярніца»** 28-га жніўня патрабуе жорсткага ўдару па апякунах антысэміта Але-ж ніводная з шматтыражак не дае гэтым выпадкам чотка клясавага апрацаваньня, а апісвае толькі факт і нават ня робіць для сваёй работы адпаведных з гэтага вываданьняў.

Гавэты да пытаньняў клясавай сутнасьці шавінізмаў усялякіх коляраў, да пытаньняў антысэмітызму, да пытаньняў інтэрнацыянальнай работы на інтэрнацыяналізаваных прадпрыемствах—не варочаюцца, лічачы дастатковым зафіксаваньне адбыўшыхся ганебных фактаў.

Тое, што вялікадзяржаўны шавінізм—галоўная небясьпека, больш чым дзе адчуваецца ва ўсіх зьвеньнях апарату Віцебшчыны. Значнае супраціўленьне беларусізацыі мы маем у розных фабрычна заводскіх краўніцтвах і канторах. За еўшыя там вялікадзяржаўныя шавіністы заспакайваюць сваё размовамі: «У нас рабочыя не разумеюць белмовы», ня бачучы значнай карэнізацыі складу рабочых (нават на «Сьцягу індустрыялізацыі» 45 проц. беларусоў).

Абгледаемыя намі шматтыражкі зусім не здавальняючы, правідловей зусім не змагаліся і не змагаюцца за беларусізацыю—важнейшую частку нацпалітыкі.

Шматтыражкі ўмудрыліся не адвесьці ніводнага радку рашэньням ЦК і гаркому па нацпытаньню, нават абыйшлі моўчкі пастанову гаркому аб стварэньні гурткоў па вывучэньню белмовы. І пагэтаму мы ўправе сёньня апрадзяліць, што «Мэтпромавец», «Чырвоная акулярніца», «Прафінтэрнавец» сваім маўчаньнем актыўна садзейнічалі зрыву арганізацыі на „Чырвоным Мэталісьце"—8-мі, акулярнай—4-х і «Прафінтэрне"—6-ці гурткоў белмовы.

За ўвесь час газэта **«Прафінтэрнавец»** абмежавалася адным маленькім (на 4-й старонцы нумару, за 24-га ліпеня) артыкулам, дзе патрабуе **«пагльбіць і ўмядрыць»**.

«Мэтпромавец» парашыў, як кажуць, «к шапачнаму разбору», пад весьці «вынікі».

> Сёньня канчаецца тэрмін месячніку генэральнай праверкі беларусізацыі, абвешчаны сакратарыятам ЦК КП(б)Б.
>
> Трэба сказаць, што ў адносінах беларусізацыі і наогул пастаноўкі нацпытаньня **на «сёньняшні дзень справа абстаіць вельмі дрэнна»**. Справе беларусізацыі на заводзе не надавалася належнай увагі.—**На працягу месяц**

«Чырвоная акулярніца»

Ніяму не было ніводнага сходу на гэтаму пытаньню. («Мэтпромавец»—11-га ліпеня 1931 г.).

Гэтай характарыстыцы надзвычайна патрэбна, для поўнаты малюнку, дадаць, што **«Мэтпромавец» да месячніку і ў час месячніку не адвёў ніводнага радку нацпытаньню.**

«Чырвоная акулярніца» 22-га мая (адзін раз за 1931 год) адводзіць месца 28 мі радкам канстатуючага артыкулу па нацпытаньню пад загалоўкам «Дырэктыва ня выканана».

«Пастанова аб аўладаньні белмовай знаходзіцца ў загоне»—піша «Акулярніца».

Так, мы згодны. «Акулярніца», і «Мэтпромавец» і «Прафінтэрнавец» павінны апрадзяліць, што гэтае важнейшае пытаньне сацбудаўніцтва і ў іх (у газэтах) знаходзіцца ў загоне, імі (газэтамі) адкладзена ў бягучыя справы.

Дырэктыў па нацпытаньню, характарыстык яго не давальняючага ажыцьцяўленьня ў Віцебску ў нас больш чым дастатна.

Зараз справа ў мабілізацыі мас, у першую чаргу партыйных і камсамольскіх, на стварэньне рашучага пералому за іх ажыцьцяўленьне зараз справа ў нанясеньні сакрушальнага ўдару па шавіністах і ў першую чаргу вялікадзяржаўнаму; зараз справа ў канцэнтрацыі значнай часткі работы ваколінтэрнацыянальнага выхаваньня.

Важнасьць штодзённага, напорыстага вядзеньня гэтага, павінны ўцямліць усе шматтыражкі і насьценгазэты, памятуючы, што ў барацьбе за беларусізацыю яны павінны прыгрымліваць арганізацыі шырокай дабраахвотнасьці на гэту справу рабочых і бясспрэчнага тэрміновага пераводу апарэтаў на белмову, улічваючы, што ў адносінах да служачых магчымы прымусовыя меры ўзьдзеяньня.

ЗА НАСТОЙЛІВУЮ БАРАЦЬБУ

...жыцьцяўленьні ленінскай нацыянальнай палітыкі

...ганова сходу партактыву, ад 25-га верасьня, па дакладу сэкратара гаркому партыі т. Судакова)

...старыстыка, дадзеная ў ...ве аб'яднанага пасе...бюро ЦК і прэзыдыуму (б)Б, зьяўляецца і на ...ні дзень жыцьцёвай, ...ча з ажыцьцяўленьнем ...ку ленінскай нацыянальнай палітыкі працягвае заста...ні на сёньняшні дзень ...зяўляецца самым глыбо...рывам у рабоце віцеб...ганізацыі».

...ваньне ў правядзеньні ...зацыі, адсутнасьць ра...ход працоўных нацмен...і слабая пастаноўка ...ыянальнага выхаваньня ...ых мас ва ўмовах аб...ай клясавай барацьбы, ...да шматлікіх выпадкаў, ...вялікадзяржаўнага, а ...беларускага і яўрэйска...нізмаў на прадпрыем...ўстановах пры неда...ай барацьбе з імі. Пар...прафсаюзны, савецкі, ...чы і каапэрацыйны апа...ларусізаваны зусім ...з пастановы ЦК і ЦКК). ...дзячы на вызначэньне ...ім пленумам гаркому ...канкрэтных мерапрыем...ліквідацыі гэтага глы...рарыву, партарганізацыя ...е дабілася належнага ...гэтай галіне, і гэта ...го ўвесь партыйны ак...э не ўзяўся належнымі ...за выкананьне пастано...ЦКК і ліпнёўскага пле...ркому па нацпытаньню. ...тага часу не выканана ...а гаркому партыі аб ...цыі сеткі гурткоў, пры...ючы іх заняткі да зьмен ...на прадпрыемствах і ўстановах і 100-процантным ахопе імі ўсіх неўладаючых беларускай мовай.

Адзначыць, што рад калектываў і ячэек ня здолелі арганізаваць інцыятывы рабочых на добраахвотнае вывучэньне беларускай мовы, неўладаньне рухам за стварэньне беларускай сацыялістычнай культуры. Не выкананы кантрольныя лічбы ліпнеўскага пленуму ГК аб арганізацыі гурткоў па вывучэньню беларускае мовы («Дзьвіна—6, лесазавод—2, „Прафінтэрн"—3, Лекерта—5, «Чырвоны мэталіст»—8, акулярная—4, «Сьцяг індустрыялізацыі» — 6, панчошная—5).

Невыкананымі застаюцца яшчэ шэраг вызначаных пастановай ліпнеўскага пленуму ГК мерапрыемстваў, якія былі накіраваны на разгортваньне масавай работы па абслугоўваньню нацменшасьцяў (выпуск нацыянальных аддзелаў у газэце „Віцебскі Пралетары" па радыё, арганізацыя нацыянальных старонак пры газэтах „Панчошніца", «Мэтпромавец», «Акулярніца», „Дзьвіна", «Молат», зрываецца камплектаваньне нацыянальных аддзяленьняў пры камвузе, пры прафшколах, нац.-тэхнікумах, а таксама арганізацыя нац. куткоў і ліквпунктаў у прыгарадным раёне).

Адзначыць, што некаторыя кіраўнікі ўстаноў не выканалі пастанову нацкамісіі, зацьверджаную прэзыдыумам гарсавету, аб зьняцьці з працы супрацоўнікаў за супраціўленьне беларусізацыі. Актыў кваліфікуе гэта як прымірэнскія адносіны да вялікадзяржаўнага шавінізму і адабрае пастанову бюро гаркому аб перадачы гэтых кіраўнікоў установу (Жыбінскага—пошта, Бабіцага—ашчадкаса, Ваўчка—камтрэст, Авербуха—будаб'яднаньне, Бейліна—сампасаюз і Рафа овіча—саюзтранс) у КК РСІ для прыцягненьня да партадказнасьці.

Партактыў падкрэсьлівае неабходнасьць настойлівай барацьбы за поўнае ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі і яе неадлучнай часткі — беларусізацыі. Вызначаныя ліпнеўскім пленумам гаркому канкрэтныя мерапрыемствы ў гэтай галіне павінны быць поўнасьцю ажыцьцяўлены, пры гэтым памятуючы, што „за буйнейшыя прарывы на важнейшых вучастках работы адказвае ня толькі гурток, але і партыйны актыў у цэлым і шчо хутчэйшая ліквідацыя прарыву магчыма толькі пры цесным спалучэньні актыву і ўсёй партарганізацыі навокал генэральнай лініі партыі, мабілізацыю шырокіх рабочых мас, калгасьнікаў і бяднякаў-сярэдняцкага сялянства на барацьбу за павышэньне тэмпаў сацыялістычнай індустрыялізацыі, за ажыцьцяўленьне лозунгу суцэльнай калектывізацыі».

Партактыў адабрае пастанову бюро гаркому аб арганізацыі з 1 па 20 кастрычніка двухдэкадніка масавай праверкі выкананьня дырэктыў ЦК і ліпнеўскага пленуму гаркому па нацпытаньню, аўладаньні ўсімі членамі партыі беларускай мовы і ўсіх непрайшоўшых праверку супрацоўнікоў дзяржаўнага, каапэратыўнага, гаспадарчага і прафсаюзнага апаратаў.

Па радые

МАНЭЎРЫ СКОНЧЫЛІСЯ

Раён манэўраў. 26-га верасьня (Белта)

Трэцьці этап манэўраў адзначыўся новым уздымам баявога энтузыязму байцоў і начскладу. Манэўры яшчэ раз падцьвердзілі іх рэвалюцыйную адданасьць справе сацыялізму. Гэта знайшло свае выяўленьне ў поўным падтрыманьні генэральнай лініі нашай партыі, уступленьні ў партыю і КСМ 1500 чалавек, у калгасы—1400, у дасканалым выкананьні баявых задач і высокім палітыка-маральным становішчы.

Апошні этап, як і папярэднія, зьявіўся праверкай баявых якасьцяў камандзіра, яго ўменьня змагацца за высокую баявую падрыхтоўку часткі, кіраваць ёю ва ўмовах складанага бою.

Трэба адзначыць байцоў і камандзіраў-гэрояў манэўраных палёў.

Каманда кабельнай роты атрымала заданьне зьвязаць станцыю Н-скай з штабам корпусу. Прадстаяў 28-кілёмэтравы начны пераход з наводкай лініі. Праца адбывалася пад бесьперапынным праліўным дажджом. Па дарозе прыходзілася выцягваць павозкі, якія завязьлі ў балоце, цягнуць іх на сабе. Ня гледзячы на цяжкасьці, заданьне было выканана дасканала і ў тэрмін бяз ніводнай пацёртасьці ног і ніводнага захворваньня. Настрой байцоў застаўся бадзёры. За добрую працу ўсяму асабоваму складу роты абвешчана падзяка Асабліва адзначаем баенкомароты Зелянава, які неадступна знаходзіўся з байцамі і непасрэдна кіраваў працай часткі.

За рашучасьць, адвагу і ініцыятыву, якія былі праяўлены тав. Зелянавым за увесь час манэўраў, яму абвешчана падзяка і ўзьнята хадайніцтва аб узнагародзе яго каштоўным падарункам.

Выконваючы апэрацыйныя заданьні па выездцы ў дажджлівую ноч, экіпаж авіаэскадрыльлі „Ультыматум" даў каштоўныя дадзеныя аб праціўніку. За добрасумленнае выкананьне заданьняў экіпажу абвешчана падзяка.

Іваноў, Марковіч, Цыганаў, Мацьвееў, Усоўскі і Чэвеў атрымалі падзяку загадам па арміі.

Баявы ўздым байцоў не паслаблаецца. Шэраг злучэньняў зварачваецца на зімовыя кватэры ў паходным парадку.

Выклікаю на спаборніцтва

У выкананьне пастановы СНК БССР аб перабудове работы мэдпунктаў на прадпрыемствах і дэкрэтаў аб санітарным мінімуме, я—урач пункту аховы здароўя фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі» Шмідт абвяшчаю сябе ўдарнікам і выклікаю на сацспаборніцтва ўсіх урачоў пунктаў аховы здароўя гор. Віцебску па наступных пунктах:

1. На большае зьніжэньне захворваемасьці і выпадкаў траўматызацыі на прадпрыемствах шляхам:

а) Сыстэматычнага вывучэньня прычын захворваемасьці і выпадкаў траўматызацыі, б) неадкладнага зьнішчэньня тых шкодных момантаў, якія выклікалі тую ці іншую хваробу, в) лепшага, чулага і своечасовага абслугоўваньня першай дапамогай рабочых на прадпрыемствах, г) выяўленьня сымуляцыі і агравацыі і вывучэньня іх сацыяльнай глебы, д) найбольшага ахопу рабочых і служачых фабрыкі санітарна-асьветнай прапагандай.

2. На больш шырокае, датэрміновае і рашучае правядзеньне ў жыцьцё санітарнага мінімуму ў цэхах, сталоўцы і наогул на фабрыцы.

3. На хуткае і больш адказнае выкананьне дырэктыў гарадзкой інспэктуры аховы здароўя і саюзнай арганізацыі.

4. На актыўны ўдзел у грамадзкім жыцьці фабрыкі, удзел у фабрычным і гарадзкім друку, на поўную беларусізацыю пункту аховы здароўя.

Пакончыць з апартуністычнымі адносінамі да фізкультуры

Фізкультработа на дадзеным этапе адыгрывае вялізарнейшую ролю ў справе падрыхтоўкі кадраў палітычна вытрыманых, стойкіх, фізычна здаровых байцоў за прамфінпляк. Фізычная культура зьнішчае антысанітарныя навыкі, дысцыплініруе і закаляе рабочых у барацьбе за саніміным. Правільная арганізацыя фізкультработы на прадпрыемствах зьяўляецца адным з магутных сродкаў інтэрнацыянальнага выхаваньня мас. У рашэньнях партыйных і прафсаюзных арганізацый неаднаразова падкрэсьлівалася вялізарнейшая роля работы фізкультарганізацый, як аднаго з рычагоў выхаваньня сапраўднага і стойкага барацьбіта за сацыялістычны быт.

Гарпрафсавет зрабіў сталую праверку становішча работы паасобных гурткоў фізкультуры на прадпрыемствах. Трэба адзначыць, што па шэрагу прадпрыемстваў («Чырвоны мэталіст», «Сьцяг індустрыялізацыі» і інш.) ёсьць сапраўдныя энтузіясты, сапраўдныя арганізатары ўдарніцкага руху і фізкультработы на вытворчасьці. Гэрачныя прыклады ўдзельні каў вэлёпрабегу сьведчаць аб вялікіх посьпехах паасобных фізкультарганізацый.

Разам з гэтым агляд выявіў апартуністычныя адносіны некаторых камсамольскіх ячэек («Прафінтэрн»), «Дзьвіна») да кіраўніцтва фізкультработай.

Фізкультарганізацыі Віцебску складаюцца на 65 проц. з камсамолу. А між тым у арганізацыі вэлёпрабегу і лодачнага паходу гарком КСМ ня прыняў ніякага ўдзелу.

Твар ФЗМК у фізкультрабоце

Выходзячы з пастаноў УсеЦСПС, гарпрафсавет даў усім ФЗМК дырэктыву аб уключэньні ва ўсесаюзны конкурс—агляд фізкультработы. Аднак праверка паказала, што шэраг заўкомаў нядбайна адносяцца да сваіх абавязкаў па непасрэднаму кіраўніцтву фізкультработай на вытворчасьці. Фабкомы не займаюцца справай уцягненьня старых рабочых у гурткі фізкультуры, не дабіваюцца ўнядрэньня зарадкавай гімнастыкі, не займаюцца зьнішчэньнем прафшкоднасьцяў праз ужываньне фізычных мэтадаў выхаваньня і г. д. Гарпрафсавет выкрыў яўна шкодныя адносіны частку фабкомаў («Прафінтэрн», «Дзьвіна» і інш.) да фізкультработы.

Такія адносіны да столь важнага вучастку профработы далей нецярпімы.

Шляхі перабудовы фізкультработы

Адбыўшаяся агульна-гарадзкая канфэрэнцыя фізкультарганізацый узяла пад агонь бальшавіцкай самакрытыкі становішча фізкультработы па Віцебску.

Гэтая канфэрэнцыя зьявілася паваротным этапам у перабудове фізкультработы. Але адсутнасьць кіраўніцтва з боку шэрагу партыйных ячэек наяўнасьць самацёку з боку ФМЗК перашкаджаюць ператварэньню фізкультурных арганізацый, у сапраўдна масавыя арганізацыі, змагаючыяся за генэральную лінію партыі.

За сапраўдную перабудову

Работаць па новаму, гэта значыць своечасова падхапляць дырэктывы партыі і ўраду і мабілізоўваць масы на іх выкананьне.

Бюро прыняло пастанову аб тым, каб шырока разгарнуць сацспаборніцтва паміж гуркамі на лепшую арганізацыю сустрэчнага прамфінпляну 4 га кварталу, на лепшае правядзеньне конкурсу-агляду фізкультработы.

За ажыцьцяўленьне гэтых пастаноў, за сапраўдную перабудову мэтадамі соцспаборніцтва павінны змагацца ўсе фізкультурнікі. Заўкомы і ўсе прафарганізацыі павінны ўзначаліць творчы энтузыязм барацьбітоў за пяцігодку і канкрэтна дапамагчы гуркам ажыцьцявіць гэтыя задачы.

Камсамол павінен сказаць своё слова і ліквідаваць прарыў на гэтым баявым вучастку.

М. Р.

Фізкультура ў барацьбе з прафшкоднасьцямі

Значэньне фізкультуры, як мэтаду барацьбы з прафшкоднасьцямі, асабліва яскрава выяўляецца ў прымяненьні камплексу фізпрактыкаваньняў і другіх сродкаў фізкультуры, які б насіў характар аздаравіцельны і прафілактычны. У Віцебску ў гэтым напрамку яшчэ нічога ня зроблена.

Вопыт работы ў некаторых гарадох Беларусі паказаў добрыя вынікі ў сувязі з тым, што там уся фізкультурная праца перабудоўваецца па вытворчаму прынцыпу. У кожным гуртку фізкультуры павінны быць складзены групы па барацьбе з прафшкоднасьцямі.

Гэтым пытаньнем павінны заняцца навукова мэтадычны сэктар ГСФК і аддзел аховы здароўя. Трэба стварыць адпаведныя ўмовы для барацьбы з прафшкоднасьцямі.

Косы.

Пасяджэньні выяздкой партройкі ЦКК КП(б)Б у Віцебску

ПК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што ў г. Віцебску 5 га і 6 га кастрычніка будзе працаваць выяздная ПТ ЦКК КП(б)Б, пад старшынствам члена ПК ЦКК т. **Блоштэйна** па разгляду апэляцый. На ПТ павінны зьявіцца:

На 5-е кастрычніка

Зарэцкі В. В., Краўле Ф. Е, Сучкоў І. М., Бесарабскі Ф. А., Міхайлаў І. Н., Рабчэнка З. Я., Цітаў П. В., Паньчелееў П. Ф., Кірпічоў С. Т., Герын І. В, Трэцьцякоў І. В, Савіцкі К. Ю, Шаадыка С. К., Харытановіч К. З., Брыкава А. К., Безьлюдаў Ул. М., Левін С. М., Ахрамейка Ф А., Мядзьведзеў І. М., Саўліч В. І.

На 6-е кастрычніка

Жыглеўскі Е. С., Бергер К. Ш., Кажэмякін І. П., Анішчанка П. Р. (б. Багушэўскае п. а.), Шабэка К. П. (б Багушэўскага п. а.), Дзятлоўскі Д. П. (б. Багушэўскага п. а.), Старавойтава Еўдакіма (высачанскі раён), Парфімчук М. Л. (Высачанскі раён), Шырынава Я. Б. (высачанскі раён), Старавойтаў П. С. (высачанскі раён), Гутковіч Я. Я. (бешанкавіч. раён п/о) Балтушкіна П. С (Бешанковіч. раён п/о) Гудзяна Я. І (Бешанкавіч. раён п/о) Сачыўка (н-рсуд Бешанкавіч. раён), Карчагін І. Н. (Сураскі раён), Ефрэменка П. М. (Сураскі раён п. а), Захарэнка П. І (Сураскі раён п. а.), Пальвінскага Ул. І. (Сіроц. раён).

На пасяджэньне ПТ павінны зьявіцца і сэкратары гар. ячэек, на вучоце якіх лічацца выклікаемыя таварышы.

Праезд за свой кошт.

Пасяджэньне выяздной ПТ ЦК КП(б)Б у Гарадку

ПК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што ў г. Гарадку 8-га кастрычніка будзе працаваць выяздная ПТ ЦКК КП(б)Б пад старшынствам члена ПК ЦКК т. **Блоштэйна**, па разгляду апэляцый.

На ПТ павінны зьявіцца:

Гамзелеў С. В., Краўчанка Ф. Я., Бадзяло Т. А., Віткоўскі (РК КП(б)Б), Саўцін І. К. (Гарадоцкі раён). Конюхаў П Л, Клюяў Я. А. (б. Межынскі раён).

На пасяджэньне ПТ павінны зьявіцца і сэкратары ячэек, на вучоце якіх лічацца выклікаемыя таварышы.

Праезд за свой кошт.

Пасяджэньне бюро скаргаў

Сёньня, 28-га верасьня, а 6 гадзіны ўвечары, у памяшканьні РСІ (пакой № 4) адбудзецца пасяджэньне бюро скаргаў, заседацелі—Блюмкін і Перах.

Будуць разглядацца наступныя справы:

1. Справа хлебазаводу (дакл. т.т. Пузікаў, Бучвіч і Рабіцкі).

Выклікаюцца: 3 кутнік хлебазаводу, мэханік хлебазаводу Васютовіч, рабочы скурававоду Шпрыц, а таксама запрашаюцца рабочыя хлебазаводу, вольныя ад працы.

2. Справа саюзу працасьветы (дакл. Корзін).

Выклікаюцца: старшыня саюзу працасьветы Верынава, прадстаўнік гарпрафсавету і настаўнік Ханін.

3. Справа аддзелу кадраў (дакл. Крошчэнка).

Выклікаюцца: заг. аддз. кадраў Маскалёў, заг. сабезу Выдрэвіч, заг. 17-й сталоўкай Нэдлін, прапаўнікі адз. грамадзкага харчаваньня Шыпо і Карэ.

4. Справа ФЗВ панчошніц (дакл. т.т. Жалязьнякоў і Карпін).

Выклікаюцца: 3-кутнік ФЗВ панчошніц, старшыня ф-му панчошнай фкі Кейф, рабочыя Ліўшыц, Касіеў і Донетман, таксама запрашаюцца рабочыя панчошнай фкі і вучні ФЗВ вольныя ад вячэрняй працы.

5. Справа камтрэсту (дакл. Панічаў).

Выклікаюцца: прадстаўнік камтрэсту, шофер Глушко і кандуктар Іванова Е.

Таксама запрашаюцца члены бюро скаргаў, дабрахвотнікі, дэлегаткі жонаддзелу і «ЛК».

Сёньня выступае Міхась Эрдэнка

Сёньня адбудзецца адзіная гастроль заслужанага артыста рэспублікі **скрыпача Міхася Эрдэнка** і вядомай піяністкі **Дзіны Гольцэр.**

Гастролі Эрдэнка ўсюды праходзяць з выключным посьпехам. Яго выкананьне і натхняючая музыка захапляе слухача. Бездакорны зьяўляецца выкананьне піяністкі **Дзіны Гольцэр.**

30-га верасьня адбудуцца пленумы ўсіх секцый, а 7 гадз. увечары

Аховы здароўя — на шчотачнай фцы (Валадарская вул.).

Адм.-прававой — у памяшканьні пракуратуры (Замкавая № 24).

Вайсковай—у памяшканьні гарсавету (пакой № 33).

Прамысловай — клюб мэталістых.

Грашовай — у памяшканьні гарсавету (пак. № 23).

Навэрацыйнай — клюб мэталістых

Сельска-гаспадарчай — дом селяніна.

Камунальнай — клюб камунальнікаў.

Бытавой—клюб будаўнікоў.

Р. І—клюб швэйнікаў.

Нарасьветы — дом працасьветы.

Працы і забясьпекі — клюб сам прамсаюзу.

Зьлёт чырвоных партызан

2-га кастрычніка, а 7 гадзіне ўвечары, у памяшканьні Палацу працы (пакой № 11) адбудзецца зьлёт чырвонагвардэйцаў, чырвоных партызан і ўдзельнікаў грамадзянскае вайны, знаходзячыхся ў горадзе Віцебску.

ЗА РУБЯЖОМ

Кіпцюры японскага імпэрыялізму моцна трымаюць Кітай

„Зацікаўленыя" дзяржавы хочуць уварваць валак здабычы

ТОНІЁ. Японскія войскі занялі Таонань і ўзялі ў сваё рукі кіраўніцтва Таонань - Цыцыкарскай чыгункай. Горад Цыцыкар бяз бою пакінуты кітайскімі войскамі. Такім чынам, ужо ўсе чыгункі Манчжуры знаходзяцца ў руках японцаў.

Японскія газэты пішуць, што зараз настаў час для перамоў з Кітаем. Усялякае ўмяшацельства Лігі нацый Японіяй будзе адхілена.

ПАРЫЖ. Францускія газэты ўсялякім чынам апраўдваюць выступленьне Японіі ў Манчжуры, агаварваючы, аднак, пра... гіх імпэрыялістычных ... на ўдзел у эксплёатацыі ... цоўных мас Кітаю пасьля ... дзеньня там „парадку".

Газэта «Ом Ліёр» заяўляе: «Адбылася гэта... пленьне са згоды Жэнэвы, бо бяз згоды, але добра... што дзяржавы парадку (г. Японія) узвышае там, у ... журы, свой голас. Пасьля ... га выступленьня паміж ... зацікаўленымі ў кітайскім ... ку, будзе дасягнута згода».

Зьверскія расправы японскай ваеншчыны з ... цыйным рухам у Манчжуры

БЕЙПІН. Японская ўлада бязьлітасна расправуляецца з антыімпэрыялістычнымі і рэвалюцыйнымі элемэнтамі Манчжуры. Палітзьняволеных карэйцы пераводзяцца з кітайскіх турмаў у Карэю, дзе іх чакае сьмерць альбо катарга. У Мукдэне японскай жандармэрыяй ... 20 кітайцаў.

Ня гледзячы на зьверскі ... раёне Цзяндао, гірынскай ... пачалася забастоўка ... японскіх вугальных капалях. ... бастоўка мае яскрава ... характар.

Разгул белага тэрору ў Польшчы

БЭРЛІН. Як паведамляюць з Варшавы, па ўсёй Польшчы адбываюцца масавыя арышты рэвалюцыйных рабочых. У рабочых кварталах штодзённа вытвараюцца вобыскі. Палітзьняволеныя ў турмах жорстка катуюцца. Супроць абвясьціўшых галадоўку палітзьняволеных ужываюць усе сродкі паліцэйскага тэрору: ... еньне, штучнае кармленьне ... рэньне вадой і г. д.

Шмат палітзьняволеных ... на. У гродненскай турме ... зьняволеных закатаваны ... У беластоцкай турме ... ад пабояў.

Міжнародная хроніка

ВАРШАВА. У сувязі з паглыбленьнем эканамічнага крызісу, у Варшаве штодзённа здбываюцца самагубствы. У варшаўскіх школах зарэгістравана 30 тысяч галадаючых дзяцей. У горадзе зарэгістравана 15 тысяч бясспрытульных.

ЛЁНДАН. Падзеньне фунту стэрлінгу правяцца і дасягнула ўжо 30 проц. ранейшай яго каштоўнасьці.

ЛЁНДАН. Паліцыя зрабіла вобыск ў рэдакцыі газэты «Дэйлі Уоркер» (ворган кампартыі). Выкрэсліла заметкі аб бунце ў флёце ... вала загадчыка в давецтва.

НЬЮ-ЕРК. У Скрэнтоне (... Пэнсільвэніі) пачалася ... 7 тысяч вуглякопаў супроць ... жэньня зарплаты.

ЛЁНДАН. У княстве Кашмір (... ночная Індыя) паўсталі сяляне ... паўстанцаў дасягае 50 тысяч ... вае войска не рашаецца ... супроць іх.

АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ ЗЬЛЕТ НАВІЧКОЎ АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ

Як уцягнуць усіх навічкоў у гаспадарча-палітычную ... Як рост замацаваць.

Паўсюды на агульна-гарадзкім зьлёце навічкоў — ... мольцаў.

На зьлёце выступяць: сэкратар гаркому партыі т. Су... сэкратар гаркому КСМ т. Лавін.

Выступяць лепшыя ўдарнікі фабрыкі «Дзьвіна», імя К. ... кін, «Сьцяг індустрыялізацыі», акулярная.

Прыехаўшая з Амэрыкі камсамолка **Дора Кац** раска... барацьбе камсамолу Злучаных Штатаў.

Пасьля—калектыўны прагляд новай інсцэніроўкі ТРАМ «... мацуем».

На зьлёце—выстаўка.

Ячэйкі, калектывы! Хто лепш падрыхтуецца?

Хроніка ЦРК

Даводзіцца да ведама ўсіх пайнікаў ВЦРК, усіх ЗРК і ТПО, што з кастрычніка м-ца 1931 г. кожны пайнік памянёных каапарганізацый, для атрыманьня хлеба мае права па свайму погляду прымацавацца да любой хлебнай крамы, дае яму пад ручна ў любой каапэрацыйнай ... нізацыі гораду.

Прымацаваньне вытвараецца ... ны месяц, пачынаючы з 26 ... ліку на наступны месяц. Уп... паючыя пайнікі маюць пра... цавацца на працягу ўсяго ... моманту ўступленьня ў пайнікі.

Адк. рэдактар Ю. Сыт...

Пасяджэньне цэнтральнай нацкамісіі БССР

Сёньня, а 7 гадз. увечары, у памяшканьні Палацы працы (пак. № 11) адбудзецца выяздное пасяджэньне цэнтральнай нацкамісіі Беларусі, супольна з членамі гарсавету, актывістымі, прафсаюзным актывам і рабкорамі.

Абвестка дню: Даклад гарадзкой нацкамісіі аб практычным ажыцьцяўленьні нацыянальнай палітыкі (дакладчык тав. Жуковіч).

Члены гарсавету і савецкі актыў праходзяць па сваіх мандатах і пасьведчаньнях. Прафактыў ці рабкоры—па білетах, выданых фабкомамі.

Прэзыдыум гарсавету.

Нарада членаў рэдкалегій насьценгазэт навучальных устаноў

30-га верасьня, роўна а 6 з палоўнай гадз. увеч., у памяшканьні рэдакцыі (Палац працы, пакой 40) адбудзецца нарада членаў рэдкалегій насьценгазэт (партыйцаў і камсамольцаў) усіх навучальных устаноў г. Віцебску.

На парадку дню—вельмі важныя пытаньні.

Яўка абавязкова.

Рэдакцыя «В'ч. Праа...».

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР

Сеньня, 28-га верасьня

На звароту з-за мяжы заслужонага артыста рэспублікі МІХАІЛА ЭРДЭНКА і вядомай піяністкі ДЗІНЫ ГЭЛЬЦЭР

ТОЛЬКІ АДЗІН КАНЦЭРТ

У ПРАГРАМЕ: творы класычныя, лірычныя і сучасн. кампазыт.

Пачатак у 8 з паловай гадзін увечары.

Білеты ў касе тэатра з 12—2 і з 5—10 гадз. увечары.

Уноў арганізаванаму у ВІЦЕБСКУ Керамічнаму Трэсту

ПАТРАБУЮЦЦА: 3 вопытных бухгальтара, 3 рахункаводы, 1 тэхнік-будаўнік, 1 тэхнік-кераміік, 1 пляновік.

Аплата па зговоре. З прапановамі зварочвацца на цагельны завод Прамтрэсту да тав. Рубінштэйна.

КЕРАМТРЭСТ.

1393—3—1

ПАТРАБУЮЦЦА: СТАРШЫ БУХГАЛЬТАР, БУХГАЛЬТАРЫ І РАХУНКАВОДЫ для працы ў БЕЛЗНЭРГО і Кіраўніцтва Сеціі

Месца працы—б. АСІНБУД.

Стаўкі па ўзгодненьню, кватэры і камунальныя паслугі прадастаўляюцца. Асабовыя перамовы з ... шым бухгальтарам Віцебскага Аддзяленьня ЭНЭРГО (Калініна, № 22).

ГАРТЭАТР (Канатная вуліца) СПЭКТАКЛІ РАСІЙСКАЙ ОПЭРЫ

Сёньня, панядзелак, 28-га верасьня,

МАЗЭПА

у 6-ці малюнках, муз. Чайкоўскага.

Пач. а 8½ гадз. Білеты ў касе тэатру з 12—2 і з 5—10 г.

БЕЛДЗЯРЖКІНО

МАСТАЦКІ Пачатак 1-га сэансу а 6½ г. З 24-га верасьня — другая сэрыя Тарас Шэўчанка

СПАРТАК Пач. 1-га сэансу а 7 гадз. З 28 верасьня—2 фільмы ў адзін сэанс Новы савецкі фільм СОНЕЧНЫ ПЫХАД. Зьмяш праграмы — новы замежны фільм ЧАРЛІ-АКТОР у гал. ролі Чарлі Чаплін.

З 30 га верасьня ўноў пасьля рамонту адчыняецца ТЭАТР ПРАЛЕТКІНО. Ставіцца найлепшы фільм Дзяржаўны чыноўнік. Пачатак 1 га сэансу а 6 гадз. 30 хв.

АБЯВА.

Пры клюбе «ЧЫРВОНЫ НАСТРЫЧНІК» Сампрамсаюзу ПАЧАЛІ ПРАЦУ МАСТАЦКІЯ ГУРТКІ: вуразэйскі, бел. пуск і аркестр духавой музыкі.

Жадаючыя працаваць у вышэйпаказаных гурткох, могуць падаць заяву загадчыку клюба штодзённа ад 8 да 10 гадз. вечару, канцэлярыя клюбу (Валадарская, 26).

ПРАЎЛЕНЬНЕ КЛЮБА.

1380—3—3

Нарад у ФЗВ чыгуначнікаў

ВІЦЕБСКІМ АДДЗЯЛЕНЬНЕМ ОЗЕТ АТРЫМАН НАРАД У ФЗВ ЧЫГУНАЧНІКАЎ НА 10 АСОБ, у Ле Інград для ўдарэйскай працоўнай моладзі.

Умовы паступныя: адукацыя ня ніжэй 5 груп, узрост ад 15 да 17 ці гадоў, паступа чыя павінны быць зусім здаровыя, пазбаўленыя выбарчых правоў ня прымаюцца.

Усе накіроўваемыя павінны мець на руках даведкі: аб сацыяльным становішчы, права голасу бацькоў, узросьце, мэдаглядзе, адукацыі.

Агульным памяшканьнем і зарплатай прынятыя забясьпечваюцца; па сканчэньні ФЗВ атрымоўваюць спэцыяльнасьці: сьлесара, паравозьніка, сталяра, ліцейшчыка і інш.

З заявамі зварочвацца ў гарсавет, пакой 26, з 9 да 12 гадз. дню штодзённа да 3 кастрычніка.

Паступаючыя павінны да 5-га кастрычніка быць у Ленінградзе. 1392—1—1

Згублены і ўкрадзены ніжэйпаказаныя дакументы, якія лічыць несапраўднымі:

Па гораду:

Пропуск панч. ф-кі № 2309 Аўгусьціновіч А. І. 5728

Сяброўскі білет саюзу сельгаслесрабач. № 39642 Тулупава Г. М. 5729

Пасьведч. аб службе, выд. тракт. Цэнтр. № 5 Тулупава Г. М. 5730

Нарад страхкасы куст. пом. каапэр. на зуб. протэзы № 46—27/III—31 г. Гельман Р. Б. 5732

Мэтрыка Заводніка Л. І. 5733

2 плана зямлі Разбаева Х. Ф. 5734

Налагавыя з 1923—1931 г. Разбаева Х. Ф. 5735

Сяброўскі білет саюзу нарпіт № 1642, выд. 1928 г. Сапунова 5854

Пропуск панчошн. ф-кі № 1978 Роткіна Я. А. 5855

Наборная прам. тав. прад. ТПО і паяв. кніжка № 77316 Сільчэнкова Н І. 5856

Вайсковая кніжка Сельчанкова Н. І. 5857

Пасьведчаньне асабовасьці Сельчэнкава Н. І. 5858

Квіток пачын. абут. майст. мэталлістаў Абрына М. Х. 5859

Пропуск швэйнай ф-кі № 1017 «Сьцяг індустр.» Цюкінай М. П. 5860

Прамтавар. картка ЦРК Лазаровай Е. І. 5861

Паяв. кніжка, уклад. картка ЦРК, прам. тав., прад. набор. карткі Канапаценка Б. С. 5862

Мэтрыка Канапаценка І. Б. 5863

Даведка, выд. праф. дыспансэрам № 322 Шмідт Б. М. 5864

Сяброўскі білет саюзу мэдсантруд Шурмелевай М. Я. 5865

Кніжка «Прыхільні каў дзяцей» Шурмелевай М. Я. 5866

Абедз. кн. сталовай № 2 Шурмелевай М. Я. 5867

Паявая кніж. ЦРК, укладн. картка і хлебная картка Шурмелевай М. Я. 5868

Вайсковы білет Гарадоцкага ваенкамата Клявіна А І. 5869

2 даведкі аб стажы працы і аб тым, што зьяўляецца калгасьнікам Клявіна А. І. 5870

Вайсковы білет Белаўсава В. Я. 5872

Сяброўская кніжка саюзу скурнікааў Гурэвіча Б. А. 5873

Прам. тав. лісток ТПО Паўлючкова В І. 5874

Каапэрац. кніжка «Змычка» Селязьнёва К. С. 5875

Разьліковы лісток Кавлова С. М. 5876

Паяв. кніжка і укл. картка, 3 дзіцяч., 5 прам. тав, набор. прадукт. картак ТПО Скутова С. І. 5877

Паявая кн. № 979 чашн. райпо Ружыцкі Н. 5878

Біл. саюзу бумажн. № 63261 Лысенка М. 5879

Кніжка на харчаваньне дзіцяці Яськевіч А. 5880

Вучотная картка кня Шэршэнь А. 5881

Вучотная картка кня Хаткевіч А. 5882

Вучотная картка кня Падрэз П. 5883

Паявая кніжка Неміравa І. 5884

Паявая кніжка Неміровай С. 5885

Мэтрыка Лібман Б. А. 5886

Мэтрыка Янавіцкай Л. Е. 5887

Сяброўскі біл. саюзу працасьветы № 1204, анкета з пастановай курортнай камісіі Цітова І. С. 5888

Па Чашніцкаму раёну:

Дзьве паявыя кніжкі чашн. райпо Міцьковец Ф. 5889

Вучотная картка кня Шынкевіч К. 5890

Паявая кн. чашн. райпо Шапіро Н. 5891

Паявая кн. чашн. райпо Дуброўскі С. 5892

Асабовы вайсковы білет Шам М. 5893

Паявая кн. № 979 чашн. райпо Ружыцкі Н. 5894

Біл. саюзу бумажн. № 63261 Лысенка М. 5895

Кніжка на харчаваньне дзіцяці Яськевіч А. 5896

Вучотная картка кня Шэршэнь А. 5897

Вучотная картка кня Хаткевіч А. 5898

Вучотная картка кня Падрэз П. 5899

Паявая кніжка Неміравa І. 5900

Паявая кніжка Неміровай С. 5901

Вучотная картка кня Люхтэр Ш. 925

Кв ток чашн. райпо на 50 руб. на прамтавары Флаксман С. 926

Вучотная картка кня і асабовы вайсковы білет Карчагін К. 927

Паявая кн. чашн. райпо Серабро І. 928

Квіток чашніц. райпо аб прыёме грошай за прамтавары Чэпік Д. 929

Паявая кн. чашн. райпо Красоўскі М. 930

Паявая кніж. № 282 Чашн. райпо Шнейдэрман Р. 931

Асабовая вайсковая кніжка Чаш. РВК Аніськовіч Е. 932

Асабовая вайсковая кніжка Чаш. РВК Кірыкіж В. 933

Асабовая вайсковая кніжка Чаш. РВК Богадзяж А. 934

Асабовая вайсковая кніжка Чаш. РВК Колмак І. 935

Асабовая вайсковая кніжка Чаш. РВК Мардзіновіч І. 936

Асабовая вайсковая кніжка Чаш. РВК Гаранскі А. 937

Асабовая вайсковая кніжка за № 224 Чаш. РВК Славак 938

Саюзны білет Аршанскага № 6 дарстройучастка Шыдлоўскі Б. 939

ВУЧДОРУ— ПАТРЭБЕН ІНЖЫНЭР-ЭКАНАМТ

Аплата па згодзе. Зьвяртацца: Аршанскае, 32/3.

Вучдор—1 ... 1387—2

Паявая раб. кніжка Чаш. райпо Букштэй П.

Вайсковая кніжка Чаш. РВК Курто М.

Паявая кніжка Чаш. р-на Падрэз М.

Вайсковая кніжка Чаш. р на Баркевіч І.

Вайсковая кніжка Чаш. р на Лях М.

Білет курсанта Бучык П.

Паявая кніжка Чаш. р-по Кіркіж А.

Вайсковая кніжка Чаш. р н Непомілуй П.

Вучотная картка кня Папко В.

Паявая кніжка Чаш. р на № 732 Вашэўскі І.

Паявая кніжка Чаш. райпо Шумановіч Ф.

Пэнсіённая кніжка № 2 Янушэўскі П.

Вучотная картка кня Парцуф Х.

Мэтрычная выпіска Зінькевіч В.

Віцгарліт № 1. Друкарня «Камінтэрн», Бальшавіцкая, 10. Тыраж 10.0...